НАСТАЎНІК — ЧАЛАВЕК, З ЯКІМ ЦІКАВА

ЧЫРВОНКА





ДОБРЫ НАСТРОЙ, ПРЫНЕСЕНЫ Ў ДЗЮБЕ

ЧЫРВОНКА


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 КРАСАВІКА 2021 г. ЧАЦВЕР № 65 (29434)


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Сяргей ШПАРЛО, начальнік Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС МНС:**

*«22 сакавіка гэтага года пастановай Савета Міністраў зацверджана Дзяржаўная праграма па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2021—2025 гады. У асноўным раздзелы ў цяперашняй праграме такія ж, як у папярэдніх. Але з'явіўся новы раздзел — па развіцці санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення дзяцей. Сёлета павінна завяршыцца будаўніцтва карпусоў двух дзіцячых рэабілітацыйна-аздараўленчых цэнтраў, якія працуюць круглы год. Гэта «Жамчужына» ў Віцебскай вобласці і «Надзея» — у Мінскай. Адпаведна, гэта будзе спрыяць таму, што большая колькасць дзяцей, якія пражываюць на забруджаных тэрыторыях, зможа прайсці аздараўленне».*

## Ля родных вытокаў



Жыхар Шклова Андрэй САЎЧУК са сваімі дзецьмі Алінай і Вадзімам часта прыязджае на рэчку Бярозаўку, на беразе якой месціцца яго малая радзіма — вёска Прасалы. На ўскраіне вёскі ў цяністым кутку б'юць крыніцы, і адна з іх — Рыгорава (па імені былога жыхара-ветэрана) — абсталявана і добраўпарадкавана. Сам Андрэй таксама прымаў удзел у будоўлі крынічнага комплексу, на сваёй прыватнай пілараме пiлiў дошкі. Але ні ў якім разе не лічыць гэта заслугай — як і іншыя, хацеў зрабіць добрае для сваіх землякоў, для памяці. Цяпер на Шклоўшчыне гэты куточак стаў вядомым, можна сказаць, знакавым. І на дзіва прывабным, бо вада з крыніцы і плынь Бярозаўкі — сапраўдныя лекі для душы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

- **Чаргове пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі адбудзецца 14 красавіка.**
- Сертыфікаты адпаведнасці на паслугі аўташкол будуць пераафармляцца да 1 сакавіка 2022 года.
- **Даследаванне беларускага анколага Дзяніса Барадзіна стала найлепшым на конкурсе маладых навукоўцаў СНД.**
- Па новай праграме «Сямейны капітал» амаль 15 тысяч шматдзетных сем'яў адкрылі дэпазіты.
- **Стартаваў прыём заявак на конкурс «Інтэрнэт-прэмія «ТІБО-2021».**
- Рэзідэнт СЭЗ «Мінск» стварыў 85 рабочых месцаў на вытворчасці грузавых кантэйнераў у Маладзечне.


ISSN 1990 — 763X


Перспектыва

## НОВАЕ АБЛІЧЧА «БЕЛАРУСКАЙ ВЕНЕЦЫІ»

**У гэтым годзе Гомельшчына рыхтуецца правесці комплекснае добраўпарадкаванне Добруша — горада фарфору, паперы і архітэктуры часоў князёў Паскевічаў.**

Абнаўленне раённага цэнтра, які нярэдка называюць «беларускай Венецыяй», стане чарговым крокам спецыяльнай праграмы, што рэалізоўваюць у рэгіёне на працягу амаль 15 гадоў. Важна, што моладзь мае намер падрыхтаваць шэраг сваіх праектных прапаноў па развіцці малой радзімы.

СТАР. 4



У сезон

## ЗАМЕСТ «АНТОНАЎКІ» — «ІМАНТ»?

«Яблычныя» клопаты беларускіх селекцыянераў

**Хочаш быць маладым — еш яблыкі, хочаш быць здаровым — еш яблыкі, хочаш быць разумным — еш яблыкі. Такое выказванне прыпісваецца Авіцэне, і калі верыць гэтаму, у нас ёсць усе шанцы быць здаровымі, разумнымі і не старэць. Як адзначаюць у Інстытуце пладаводства, беларускія глебы і клімат ідэальныя для вырошчвання яблыкаў.**



СТАР. 13

Парламенцкі дзённік

# ФІЛАСОФІЯ АБНАЎЛЕННЯ

## Дэпутаты прынялі ў першым чытанні змены ў Кодэкс аб адукацыі і Закон «Аб дарожным руху»

**Палата прадстаўнікоў правяла чарговае пасяджэнне пятай сесіі. Адзін з найбольш важных законапраектаў, падрыхтаваных да яе, — Кодэкс аб адукацыі. Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК звярнуў увагу, што абноўлены дакумент вельмі доўга рыхтаваўся да першага чытання і ў шостым скліканні дэпутаты разам з профільным міністэрствам адпрацоўвалі кожны артыкул.**

«Вельмі задаволены тым, што будзем яго сёння разглядаць. Таму мы яго прымаем у першай рэдакцыі і захоўваем філасофію кодэкса. У гэтай філасофіі ёсць цяжкая праца дэпутатаў маёй камісіі на працягу апошніх чатырох гадоў», — паведаміў парламентарый. Ён расказаў пра асабліва важныя навацыі нарматыўна-прававога акта. Дакументам уводзяцца абавязковая агульная сярэдняя адукацыя і нормы, накіраваныя на ўкараненне інклюзіўных падыходаў у сістэме. На ўзроўні вышэйшай адукацыі прадугледжваюцца бакалаўрыят (4-4,5 гады), магістратура (паглыбленая вышэйшая адукацыя 1-2 гады), паслявузаўская адукацыя — аспірантура (ад'юнктура), для пэўных тэхнічных спецыяльнасцяў і медыкаў прадугледжана бесперапынная адукацыя (5-6 гадоў).

Як расказаў Ігар Марзалюк, школьнікі паводле заканадаўства будуць вучыцца з 1 верасня да 31 мая, але навучальны год для педагогаў будзе адлічвацца з 1 верасня да 31 жніўня. Выпускнікі 9 і 11 класаў будуць сыходзіць на падрыхтоўку да экзаменаў з 25 мая.

«Дакладна вызначана ў законе, што бацькі і законныя прадстаўнікі дзяцей не маюць права ўмешвацца ў адукацыйны працэс, чым яны злоўжывалі. Па гэтыя пытанні яны павінны звяртацца ва ўстанову адукацыі», — акцэнтаваў парламентарый.

У абноўленай рэдакцыі кодэкса забараняецца аб'ядняннем, якія не маюць дачынення да сістэмы адукацыі, ужываць у сваіх назвах паняцці «школа», «ліцэй», «каледж», «універсітэт», «інстытут», «акадэмія».

З завочнай формы адукацыі выдзяляецца і прапісваецца дыстанцыйная форма, укараняецца ў праграмы модульная адукацыя.

Замацоўваецца таксама дадатковая адукацыя для адораных дзяцей і магчымасць для бацькоў першакласнікаў адпраўляць іх у школу не ў шэсць гадоў, а пазней.

Паводле слоў Ігара Марзалюка, для хлопцаў, што атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную адукацыю на бюджэце і пайшлі ў армію (у тым ліку па кантракце), тэрмін службы можа быць залічаны за адпрацоўку па размеркаванні.

Да першага чытання Міністэрства ўнутраных спраў і Пастаянная камісія па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў падрыхтавалі навацыі Закона «Аб дарожным руху». Па словах **старшыні камісіі Ігара КАМАРОЎСКАГА,** змены прадыктаваны жыццём і накіраваны на павышэнне бяспекі руху, камфорту грамадзян, бізнесу.

«Грамадзянам будзе выдавацца вадзіцельскае пасведчанне міжнароднага ўзору, будуць прызнавацца вадзіцельскія пасведчанні Расійскай Федэрацыі да канца тэрміну іх дзеяння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у рамках дамоўленасцяў Саюзнай дзяржавы. Сярод навацый нормы, якія дазваляюць навучацца, здаваць, атрымліваць вадзіцельскае пасведчанне на аўтамабілі з аўтаматычнай трансмісіяй», — паведаміў дэпутат.

Для аўташкол, па яго словах, скасоўваецца кантроль за навучаннем, падрыхтоўкай, перападрыхтоўкай, павышэннем кваліфікацыі кіроўцаў і неабходнасць узгадняць з ДАІ маршруты руху пры навучанні практычнаму кіраванню.

У першым чытанні таксама прыняты змены ў законы аб пытаннях судова-экспертнай дзейнасці, у другім — навацыі па пытаннях сацыяльных нарматываў і мінімальнай заработнай платы, аб селекцыі і насенняводстве сельгасраслін, аб спажывецкай кааперацыі і аб Следчым камітэце.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# З НАДЗЕЯЙ НА РАЗВІЦЦЁ ДОБРАСУСЕДСТВА

## Беларускі парламент адкрыты для дыялогу і ўзаемадзеяння ў любым фармаце з латвійскімі калегамі

**Пра гэта заявіла член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Ганна СТАРАВОЙТАВА падчас анлайн-сустрэчы членаў рабочай групы па супрацоўніцтве з парламентам Латвійскай Рэспублікі з паслом Латвіі Эйнарсам СЕМАНІСАМ.**

Як адзначыла Ганна Старавойтава, да 2020 года адзначалася актывізацыя міжпарламенцкага дыялогу паміж Беларуссю і Латвіяй, ажыццяўляліся кантакты ўрадаў, МЗС, вялася работа па сумесным правядзенні чэмпіянату свету па хакеі, планаваўся візіт на найвышэйшым узроўні ў Рыгу. «На жаль, пасля правядзення ў жніўні 2020 года выбараў у Беларусі Латвія замарозіла кантакты з беларускімі афіцыйнымі асобамі. Быў прыняты шэраг несяброўскіх дзеянняў, заяўленне сейма Латвіі аб непрызнанні вынікаў выбараў», — сказала дэпутат.

Па словах Ганны Старавойтавай, нягледзячы на напружанасць у палітыцы, краіны актыўна ўзаемадзейнічаюць у эканамічнай сферы. Перспектыўнымі тут кірункамі з'яўляюцца дрэваапрацоўка, фармацэўтыка, вытворчасць харчовай прадукцыі, турызм, сфера паслуг (асабліва галіна інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій). Рэгулярна праходзілі пасяджэнні беларуска-латвійскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Беларускі бок выказаўся за аднаўленне дзейнасці разнастайных сумесных камісій.

«Хацелася б падкрэсліць, што Беларусь зацікаўлена ў развіцці добрасуседскіх адносін і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з Латвіяй па шырокім спектры пытанняў. Важнай мы бачым актывізацыю супрацоўніцтва паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і сеймам Латвіі. Гэта будзе садзейнічаць развіццю ўсебаковага дыялогу ў духу добрасуседскіх адносін», — дадала Ганна Старавойтава.

Яна ўпэўнена: кантакты актывізуюцца на ўсіх узроўнях пасля адмены пандэмійных абмежаванняў і заяўляе, што беларускі парламент адкрыты да дыялогу і ўзаемадзеяння ў любым фармаце.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Латвіі ў Беларусі Эйнарс Семаніс пагадзіўся, што ва ўсіх адносінах паміж краінамі цяпер складаны час, але дыпламатычныя каналы камунікацыі павінны заставацца адкрытымі.

«Наш народ жадае, каб нашы адносіны былі добрасуседскімі і Беларусь была незалежнай, суверэннай, стабільнай, эканамічна развітой і дэмакратычнай краінай. Гэта была і будзе наша асноўная ўстаноўка», — дадаў пасол.

Ён падкрэсліў, што эканамічныя адносіны, нягледзячы на праблемы, развіваюцца. Гэта відаць па інвестыцыйных праектах, нязначным падзенні (усяго на 6 працэнтаў) у пандэмійны час гандлю. Латвійскі бок выказаўся і за больш актыўнае развіццё лагістычнага і транспартнага супрацоўніцтва.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Глабальныя расходы на анлайн-пакупкі падчас пандэміі ўзраслі на $900 млрд



У пандэмійны 2020 год пакупнікі па ўсім свеце выдаткавалі ў інтэрнэце на $900 млрд больш, чым за два папярэднія. Пра гэта гаворыцца ў даследаванні Mastercard Economics Institute, якое згадаў Forbes. Паводле прыведзеных даных, у мінулым годзе на анлайн-продажы прыпадала 20 працэнтаў ад усіх сродкаў, якія былі выдаткаваны на куплю тавараў і паслуг. Для параўнання: у 2019-м гэты паказчык складаў крыху больш за 14 %. Паводле прагнозу аналітыкаў Mastercard, у многіх краінах пераход ад традыцыйнага да анлайн-гандлю працягнецца і надалей. Ступень жа трансфармацыі ўнутры кожнай краіны будзе залежаць ад таго, наколькі электронная камерцыя была пашырана да пачатку крызісу. Напрыклад, у ЗША доля анлайн-пакупак да эпідэміі COVID-19 складала 11 %, на піку пандэміі яна дасягнула 22 %, а пасля, на думку даследчыкаў, захаваецца на ўзроўні 17 %.

### Кім Чэн Ын назваў цяперашнюю сітуацыю ў КНДР найгоршай

Паўночнакарэйскі лідар лічыць, што сітуацыя ў краіне складаецца горш, чым калі б там ні было, паведаміла Цэнтральнае тэлеграфнае агенцтва Карэі. Аб гэтым ён заявіў на шостай канферэнцыі сакратароў ячэек Працоўнай партыі Карэі. Паўночнакарэйскі лідар раскрытыкаваў партыйныя нізы за недахопы і заклікаў неадкладна іх выправіць. Як вядома, у партыйныя суполкі ў КНДР уваходзіць ад 5 да 30 чалавек. Гэта самыя маленькія адзінкі партыі, якія займаюцца наглядам за работай на фабрыках і ў іншых месцах. У лютым Кім Чэн Ын раскрытыкаваў свой кабінет за эканамічныя няўдачы краіны і звольніў галоўнага эканаміста за адсутнасць новых ідэй па выратаванні эканомікі.

### У Інданезіі дзясяткі пасёлкаў пахаваны пад апоўзнем



Ахвярамі паводак і апоўзняў у Інданезіі і Усходнім Тыморы сталі ўжо звыш 150 чалавек, дзясяткі людзей лічацца зніклымі без вестак, паведаміў Euronews. Паліцэйскія, вайскоўцы і мясцовыя жыхары разбіраюць завалы. Намаганні ратавальнікаў ускладняюцца дрэннымі ўмовамі надвор'я, да таго ж некалькі мастоў абрынуліся, дарогі заблакіраваны паваленымі дрэвамі. На інданезійскім востраве Ломблен на шляху разбуральнага апоўзня апынуліся дзясяткі пасёлкаў. «У гэтым раёне больш ніхто не будзе жыць. Мы не дазволім людзям тут сяліцца — падабаецца ім гэта ці не, але прыйдзецца пераязджаць», — заўважыў кіраўнік мясцовай адміністрацыі. Урад Інданезіі звярнуўся па дапамогу да прадпрымальнікаў, паколькі ўладам не хапае рэсурсаў для аказання дапамогі раёнам, якія пацярпелі ад стыхіі. Метэаролагі папярэджваюць, што наступствы трапічнага цыклону «Сяроя» будуць адчувацца да пятніцы.

Блізкая ўлада

# КАРЫСНЫЯ ПРАПАНОВЫ

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ правёў асабісты прыём грамадзян. На сустрэчу з кіраўніком рэгіёна запісаліся дзесяць жыхароў вобласці, тры пытанні, якія хвалявалі людзей, былі вырашаны яшчэ да прыёму.**



З просьбай выдзеліць дадатковы ўчастак для вядзення фермерскай гаспадаркі звярнуўся жыхар Буда-Кашалёўскага раёна Дзмітрый Ананьеў. Фермер ужо мае зямельны ўчастак у 15 гектараў, але просіць павялічыць плошчы. Кажа, што плануе займацца жывёлагадоўляй і вырошчваць гародніну. Старшыня аблвыканкама адзначыў, што рашэнне па гэтым пытанні будзе вызначана на месцы і пасля ацэнкі сітуацыі. Губернатар на наступным тыдні плануе асабіста выехаць у раён і азнаёміцца з работай фермерскай гаспадаркі і бізнес-планам прадпрымальніка. Але папярэдзіў, што зямля будзе выдавацца пад канкрэтныя і рэальныя ў ажыццяўленні праекты.

— Некаторыя фермеры бяруць зямлю ў арэнду і перадаюць пасля ў субарэнду, цану пытання я ведаю, і такога быць не павінна, — падкрэсліў Генадзь Салавей.

Жыхарка Чачэрскага раёна звярнулася да старшыні аблвыканкама адразу з некалькімі пытаннямі: нязручны графік школьнага аўтобуса (праблему вырашылі падчас прыёму), выдзяленне зямлі для прысядзібнай гаспадаркі і атрыманне паслуг аховы здароўя. Паводле слоў жанчыны, часам складана запісацца і трапіць на прыём да доктара ў райбальніцы. Генадзь Салавей даручыў вывучыць сітуацыю з даступнасцю паслуг установы аховы здароўя. Таксама на месцы разгледзяць пытанне аб выдзяленні пустога ўчастка зямлі яе сям'і.

Са сваёй праблемай звярнулася жыхарка Гомельскага раёна, якая пражывае разам з сынам — інвалідам першай групы. Ён валодае 1/4 долі кватэры ў пасёлку Янтарны, у якой цяпер ніхто не жыве, распавяла заяўніца. Ёсць намер прадаць маёмасць, але існуюць абмежаванні. На прыёме жанчыне растлумачылі, што паколькі ў кватэры прапісаны чалавек з інваліднасцю, і пасля ён застанецца без уласнай жылплошчы, здзелка забаронена.

З цікавай прапановай на прыём да губернатара прыйшоў старшыня маладзёжнага жыллёвага комплексу «Сонечны» Уладзімір Макараў. Яго ідэя — сфарміраваць па такім жа прынцыпе новыя комплексы ў абласным цэнтры. Гамяльчанін звярнуў увагу, што «Сонечны» больш за трыццаць гадоў таму ўспрымалі як сацыяльны эксперымент. Яго ўдзельнікі стварылі калектыў да засялення, разам вырашалі, якое будзе іх жыллё. Як вынік — у некаторых кватэрах у дамах комплексу з'явіліся індывідуальныя планіроўкі, падземная паркоўка, сацыяльна значныя аб'екты на першых паверхах.

— Па многіх параметрах мы былі аднымі з першых у краіне. Галоўная асаблівасць комплексу ў тым, што людзі самі могуць уплываць на стварэнне камфортнага асяроддзя для сябе і сваіх блізкіх, — адзначыў старшыня ЖК «Сонечны». Не так даўно мясцовыя жыхары наладзілі ў сваім парку сістэму святлозабеспячэння, якая заражаецца ад сонца. У комплексе добрая нараджальнасць, а ў дзяцей — узорная паспяховасць, распавёў аб ЖК Уладзімір Макараў і папрасіў падтрымкі ўладаў у арганізацыі міжнароднага семінара з удзелам прадстаўнікоў Расіі і Украіны ў гонар 50-годдзя руху маладзёжных жыллёвых комплексаў.

Старшыня аблвыканкама лічыць, што карысны вопыт ЖК варта вывучыць і затым па магчымасці ўкараняць пры ўзвядзенні новабудоўляў. У тым ліку падобная практыка магла б вырашыць праблему комплекснага добраўпарадкавання дваровых тэрыторый.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Кашалёк

# ШТО ПАДАРАЖЭЕ, КАЛІ І НА КОЛЬКІ?

## Апублікаваны прагноз змянення цэн у гэтым годзе

**Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю апублікавала «тарыфны сшытак» — прагноз змянення пастаянна рэгулюемых дзяржавай цэн і тарыфаў у 2021 годзе. Адпаведныя рашэнні «будуць прымацца з улікам існуючай эканамічнай сітуацыі ў краіне, інфляцыйных працэсаў ва ўвязцы з ростам даходаў насельніцтва», адзначылі ў МАРГ.**

Згодна з дакументам, пасажырскія перавозкі гарадскім транспартам «вырастуць» да канца года на 5 капеек за квіток, перавозкі прыгарадным аўтатранспартам — на 1 капейку за км. Тарыфы на пасажырскія чыгуначныя перавозкі падаражэюць у другім квартале на 15 працэнтаў.

Што датычыцца тарыфаў на паслугі ЖКГ, у першым квартале іх кошт павялічыўся на 8,9 %. У планах падаражанне ў трэцім — на 0,6 працэнта і ў чацвёртым — на 0,4 %. Тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі павышаюцца, выходзячы з гранічных значэнняў тарыфаў, вызначаных Указам ад 24 снежня 2020 года № 490 (прырост плацяжу па стандартнай кватэры не перавысіць $5 па сярэднегадавым курсе).

Тытунёвыя вырабы ў цэлым за год падаражэюць на 15,9 працэнта, моцныя алкагольныя напоі — на 4,7 %. Павышэнне звязана з ростам ставак акцызаў.

Тарыфы на ўсе віды сувязі (інтэрнэт, сотавую, паштовую, электрасувязь) у чацвёртым квартале павысяцца на 4 працэнты. Падаражаннем будуць кампенсаваць рост выдаткаў, але яно не перавысіць узровень прагнознай базавай інфляцыі.

Павышэнне тарыфаў на адукацыю (ад дашкольнай да вышэйшай) плануецца на 10 працэнтаў. Для ВНУ і школ гэта звязана з неабходнасцю кампенсацыі павышэння выдаткаў на аплату працы педагагічных і іншых работнікаў устаноў адукацыі, для дзіцячых садкоў — зближэння натуральных і грашовых нормаў спажывання.

У другім квартале на 4 працэнты павялічацца тарыфы на рытуальныя паслугі (гарантаваныя паслугі па пахаванні). Таксама ў другім квартале будзе павялічаны тарыф на ахову жылля на 0,4 базавай велічыні (цяпер 1 БВ — Br29).

Камісія па пытаннях дзяржаўнага рэгулявання цэнаўтварэння пры Савеце Міністраў узгадніла павышэнне цэн на алей, паведамілі ў Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Рост сусветных цэн на алей, які ў Беларусі адносіцца да тавараў крытычнага імпарту, прывёў да значнага павелічэння кантрактных расцэнак у сакавіку 2021 года — больш чым на 20 %. Пры гэтым цэны на асноўную сыравіну (насенне сланечніка) за сакавік выраслі на 16,7 %.

«Для забеспячэння насельніцтва гэтым прадуктам у поўным аб'ёме камісія па пытаннях дзяржрэгулявання цэнаўтварэння пры Саўміне ўзгадніла павышэнне цэн на алей (акрамя аліўкавага) юрыдычным асобам усіх формаў уласнасці і індывідуальным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюць яго вытворчасць (увоз) і (або) рэалізацыю на ўнутраны рынак у памеры, які не перавышае 15 % цэн на 28 лютага 2021 года», — падкрэслілі ў МАРГ.

# НАДЫШЛА ВЯСНА. І ПАЖАРАНЕБЯСПЕЧНЫ ПЕРЫЯД...

**«У гэтым годзе пажаранебяспечны вясенне-летні перыяд ужо пачаўся. Першы лясны пажар быў зафіксаваны 5 сакавіка на Брэстчыне. На сёння на тэрыторыі краіны ў прыродных экасістэмах адбылося 563 пажары на плошчы 56 гектараў, што на 70 працэнтаў менш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. У выніку такіх пажараў ужо загінулі два чалавекі і адзін траўмаваны. У 99 працэнтаў выпадкаў узгаранні звязаны з чалавечай бестурботнасцю: кінутая цыгарэта або падпаленая запалка, пакінутае без нагляду вогнішча, выпальванне сухой расліннасці на корані, бескантрольнае спальванне смецця, дзіцячае свавольства з агнём», — паведаміў першы намеснік начальніка ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Васіль СІЎЧАК.**



З улікам гэтага МНС загадзя рэалізоўвае комплекс мерапрыемстваў, скіраваных на прафілактыку ўзнікнення такіх пажараў і забеспячэнне гатоўнасці рэагавання на іх. «У нашых падраздзяленнях сфарміраваны спісы з тэлефонамі работнікаў, адказных за правядзенне кантролю ў дачыненні да тарфянікаў і найбольш пажаранебяспечных участкаў. У выпадку ўскладнення аператыўнай абстаноўкі прадугледжаны перавод на ўзмоцнены варыянт нясення службы асабістага складу. Пытанні работы органаў дзяржаўнага кіравання ў пажаранебяспечны перыяд у частцы недапушчэння пажараў у прыродных экасістэмах будуць разглядацца на пасяджэнні камісіі па надзвычайных сітуацыях пры Савеце Міністраў, якое запланавана на 9 красавіка», — дадаў Васіль Сіўчак.

Паводле яго слоў, у краіне створана 11 зводных атрадаў для рэагавання на пажаранебяспечную сітуацыю. «У іх склад увахо- дзяць каля 700 работнікаў падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях. На ўзбраенні гэтых атрадаў маецца больш за 330 адзінак тэхнікі, прызначанай для тушэння пажараў. Дадаткова падраздзяленні МНС забяспечаны тэхнічнымі сродкамі, якія дазволяць павысіць эфектыўнасць правядзення аварыйна-ратавальных работ і гарантаваць бяспеку грамадзян пры неспрыяльных умовах: квадрацыклы, квадракоптары, пажарная помпавая станцыя і іншая вадападаючая тэхніка. Таксама створана база спецыяльнай тэхнікі і абсталявання, што маецца ў суб'ектаў гаспадарання і прызначана для ліквідацыі надзвычайных сітуацый», — распавёў намеснік начальніка ўпраўлення.

Для своечасовага рэагавання на пажары ў прыродных экасістэмах выкарыстоўваюцца розныя віды маніторынгу: касмічны, авіяцыйны і наземны. Касмічны маніторынг дазваляе МНС аператыўна атрымліваць ад нацыянальнага касмічнага апаратара даныя аб магчымых ачагах прыродных пажараў. «У бягучым годзе такіх звестак мы яшчэ не атрымлівалі, але за мінулы год 255 пажараў было выяўлена гэтай сістэмай», — сказаў Васіль Сіўчак. Незаменна такое назіранне пры маніторынгу тэрыторый пагранічных дзяржаў. Летась у Расіі і Украіне неаднаразова выяўляліся факты ўзгарання, што дазваляла своечасова прыняць комплекс адпаведных мерапрыемстваў і не дапусціць распаўсюджванне пажараў у Беларусі.

«Маршруты авіяцыйнага патрулявання праходзяць праз найбольш небяспечныя ўчасткі, што дазваляе павысіць эфектыўнасць ранняга выяўлення пажараў. У мэтах забеспячэння авіяцыйнай аховы лясоў МНС плануе задзейнічаць 10—14 паветраных суднаў пры ўскладненні аператыўнай абстаноўкі», — працягнуў намеснік начальніка ўпраўлення. Наземны маніторынг па большай частцы вядуць работнікі Міністэрства лясной гаспадаркі, у тым ліку з пажарных назіральных вышак і мачтаў, абсталяваных сістэмай відэаназірання.

«Але адначасова хочацца звярнуцца ўсё ж такі да кіраўнікоў суб'ектаў гаспадарання, іншых службовых асоб і нагадаць, што выпальванне сухой расліннасці ў краіне забаронена. Развядзенне вогнішчаў дапускаецца толькі ў адпаведнасці з патрабаваннямі пажарнай бяспекі на тэрыторыі зоны адпачынку і турызму пры ўмове забеспячэння пастаяннага кантролю за працэсам гарэння і наяўнасці першасных сродкаў пажаратушэння».

Васіль Сіўчак адзначыў, што зараз надышла пара, калі людзі наводзяць парадак на прысядзібных участках, і ў такіх выпадках таксама неабходна захоўваць патрабаванні бяспекі. Калі чалавек спальвае смецце, гэта павінна быць на бяспечнай адлегласці ад пабудоў і пад пастаянным кантролем. Дарэчы, МНС зрабіла відэаролік «Правілы абыходжання з агнём», які размешчаны на сайце міністэрства, дзе пакрокава і дакладна паказана, як бяспечна спаліць на ўчастку смецце.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «АРСЕНАЛЬНАЕ» ПОЛЕ

**Больш за 200 боеприпасаў выяўлена ў Віцебскім раёне. Яны былі знойдзены жыхарамі на полі каля вёскі Новікі. Вяскоўцы заўважылі снарады і міны і паведамілі пра гэта мясцоваму ўчастковаму.**

Як адзначае аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, спецыялісты в/ч 5524 унутраных войскаў МУС, якія прыбылі на месца, абследавалі мясцовасць і выявілі 99 мінамётных мін калібру 82 мм, 4 мінамётныя міны калібру 50 мм, 26 артылерыйскіх снарадаў калібру 76 мм, 71 артылерыйскі снарад калібру 45 мм і 52 артылерыйскія ўзрывальнікі. Усё — часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Арсенал быў вывезены ў бяспечнае месца і знішчаны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

На слыху

# Спісы ахвотных прышчапіцца фарміруюцца ў паліклініках

**У Беларусі працягваецца вакцынацыя груп рызыкі ад каранавіруса. На гэтым тыдні ў медустановы Мінска і абласцей паступіла новая партыя (100 тысяч доз) вакцыны «Спадарожнік V», паведамілі ў прэсслужбе Міністэрства аховы здароўя.**

Партыя прайшла кантроль якасці. У краіне вызначаны паліклінікі, дзе ёсць абсталяванне, якое дазваляе выконваць усе прадугледжаныя інструкцыяй патрабаванні халадовага ланцуга.

Першымі прышчэпкі атрымлівалі работнікі аховы здароўя. Наступныя катэгорыі так званай групы рызыкі — гэта педагогі, работнікі сацыяльнай абароны, грамадзяне старэй за 61 год і тыя, хто мае хранічныя захворванні.

Спісы ахвотных прышчапіцца фарміруюцца ў паліклініках па месцы жыхарства. Адзначым, што імунізацыя застаецца найважнейшым кампанентам у барацьбе з эпідпрацэсам. Вакцынацыя праводзіцца ў добраахвотным парадку.

Нагадаем, што ў 2020 годзе Беларусь заключыла першапачатковы контракт на пастаўку двухфазнай вакцыны «Спадарожнік V» для вакцынацыі 170 тысяч чалавек. А з наступнага тыдня патрэбу ў вакцыне «Спадарожнік V» плануюць задавальняць прэпаратам, разлітым на прадпрыемстве РУП «Белмедпрэпараты».

**Алена КРАВЕЦ.**

Кампетэнтна

# ЛІЦЭЯМ БЫЦЬ

**Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА пракаментаваў сітуацыю з укідам у сацыяльныя сеткі і тэлеграм-каналы інфармацыі аб закрыцці ў краіне ўсіх агульнаадукацыйных ліцэяў. Пра гэта паведаміла Міністэрства адукацыі.**

— У цяперашні час праводзіцца работа па вывучэнні дзейнасці ліцэяў, якія рэалізоўваюць праграму агульнай сярэдняй адукацыі, з мэтай выбудоўвання агульнай сістэмы іх функцыянавання, удасканалення ўступнай кампаніі, вызначэння месца і ролі ліцэяў пры вышэйшых навучальных установах, ліцэяў у Мінску, абласных і раённых цэнтрах, у складзе якіх ёсць альбо адсутнічаюць інтэрнаты. У штогадовых планах аптымізацыі Мінскага гарвыканкама і абласных выканаўчых камітэтаў, узгодненых з Міністэрствам адукацыі, закрыццё альбо рэарганізацыя якіх-небудзь агульнаадукацыйных ліцэяў адсутнічае, — сказаў кіраўнік ведамства.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Прыёмная кампанія — 2021

# ПА ДВА ДНІ — НА МАСАВЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе сёлета 16 чэрвеня

**Першай абітурыенты будуць здаваць па традыцыі беларускую мову. Наступны іспыт — па рускай мове пройдзе 18 і 19 чэрвеня. Як і летась, для самых масавых дысцыплін адводзіцца два дні, што звязана з неспрыяльнай эпідэмічнай абстаноўкай і неабходнасцю падзяліць вялікую колькасць прэтэндэнтаў на студэнцкі білет у экзаменацыйных аўдыторыях на два патокі. У сувязі з гэтым і пад матэматыку зарэзерваваны 23 і 24 чэрвеня.**

Тэст па грамадазнаўстве абітурыенты напішуць 21 чэрвеня, па біялогіі — 26 чэрвеня, па замежнай мове — 28 чэрвеня, па хіміі — 30 чэрвеня.

2 ліпеня ў краіне пройдзе ЦТ па фізіцы, 4 ліпеня — па гісторыі Беларусі, 6 ліпеня — па геаграфіі і 8 ліпеня — па сусветнай гісторыі найноўшага часу.

Вызначаны таксама рэзервовыя дні для здачы беларускай і рускай мовы — 14 і 16 ліпеня. Грамадазнаўства, матэматыку, біялогію, замежныя мовы, хімію, фізіку, гісторыю Беларусі, геаграфію, сусветную гісторыю найноўшага часу можна будзе напісаць 14 і 18 ліпеня.

Пастановай Міністэрства адукацыі вызначаны пералік устаноў — пунктаў правядзення ЦТ і пунктаў рэгістрацыі для яго праходжання, а таксама рэжым іх работы. У Мінску, напрыклад, такіх пунктаў трынаццаць. Час работы пунктаў рэгістрацыі для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання — з 9.00 да 19.00 (у тым ліку ў нядзелю 2 мая), а па суботах (15 і 29 мая) — з 9.00 да 18.00. Тэрміны рэгістрацыі абітурыентаў для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні — з 2 ліпеня да 9 ліпеня.

Час пачатку ЦТ у асноўныя і рэзервовыя дні — 11.00.

База звестак абітурыентаў фарміруецца з дапамогай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Агульнарэспубліканскі банк даных удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# НОВАЕ АБЛІЧЧА «БЕЛАРУСКАЙ ВЕНЕЦЫІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Актыўная пазіцыя ў дачыненні да развіцця роднага рэгіёна была агучана падчас сустрэчы з маладзёжным актывам Гомельшчыны, якую правёў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** Кіраўнік рэгіёна звярнуў увагу на тое, што сёлета ў Добрушы пройдуць маштабныя работы па добраўпарадкаванні райцэнтра. Ініцыятывы моладзі на гэтым важным этапе развіцця не толькі Добрушчыны, але і рэгіёна ў цэлым, будуць падтрыманыя. Адна з прапаноў паступіла ад першага сакратара Добрушскага раённага камітэта БРСМ Таццяны Савельевай — добраўпарадкаваць папулярнае ў горадзе месца адпачынку «Востраў». Моладзь гатовая ўзяць удзел у рэалізацыі гэтага праекта. Генадзь Салавей такую прапанову падтрымаў.

Між тым, на Гомельшчыне пры комплексным падыходзе да абнаўлення абранага раённага цэнтра — традыцыйна асаблівая ўвага да стану гарадскіх інжынерных камунікацый, дарожнай інфраструктуры, жыллёвага фонду. Праводзіцца рамонт і рэканструкцыя ўстаноў адукацыі, аховы здароўя, культуры, бытавога абслугоўвання, сувязі, аб'ектаў гандлю. Ёсць выдатныя прыклады, як пасля комплекснага ўладкавання змяняюцца населеныя пункты вобласці — у мінулыя гады маштабныя работы па добраўпарадкаванні правялі ў Брагіне, Камарыне, Мазыры. Разам з тым у рэгіёне знаходзяцца рэсурсы і для абнаўлення інфраструктуры розных сфер па ўсёй вобласці. Так, летась сярод знакавых уведзеных аб'ектаў — гомельская гарадская паліклініка і пульманалагічны корпус туберкулёзнай бальніцы. Быў праведзены рамонт ва ўстановах аховы здароўя Веткі, Лельчыц, Брагіна, Жыткавіч, Петрыкава, Добруша.

— Мы выбралі шлях кансалідацыі сродкаў для выканання маштабных задач і рэалізацыі сур'ёзных планаў па добраўпарадкаванні райцэнтраў, — адзначыў Генадзь Салавей. — Так, новае абліччa ўжо атрымаў Мазыр. Наступны на чарзе — Добруш. Тут каля райвыканкама з'явіцца новая алея.

Таксама на кантролі — развіццё спартыўнай базы. Ёсць ідэі адкрыцця пляцовак па месцы жыхарства людзей, воркаўт-пляцовак, рэканструкцыі існуючых аб'ектаў. Моладзь Гомельшчыны выказвае гатоўнасць арганізоўваць нефармальныя спартыўныя фестывалі, якія дазволяць выкарыстоўваць спартыўную інфраструктуру больш эфектыўна.

Старшыня Гомельскага аблвыканкама адзначыў, што ў Добрушы запланавана ўзвядзенне футбольнага стадыёна. Губернатар падкрэсліў: усе ахвотныя могуць прапанаваць свае ідэі па развіцці райцэнтра. Ён запэўніў, што ўлады гатовыя выслухаць усе прапановы па ўдасканаленні абліччa горада і фінансава падтрымаць найлепшыя з іх.

Што датычыцца агульнарэгіянальнага развіцця спартыўнай інфраструктуры, то плануецца ўзвесці футбольныя стадыёны таксама ў Чачэрску і Рагачове. У парадак прывядуць спартпляцоўку Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны. У найбліжэйшыя два гады ў абласным цэнтры будзе праведзена рэканструкцыя басейна ў Ірынінскай гімназіі, басейна «Дэльфін» і крытага ледзянога катка на Рэчыцкім праспекце Гомеля.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# «Гэта наша спадчына, якую стварылі беларусы»



**Рэзідэнцыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зноў адчыніла свае дзверы для экскурсійнай групы. Учора Палац Незалежнасці наведалі прадстаўнікі грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі».**

Традыцыйна гасцей сустракала прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля Эйсмант. Яна расказала, што па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы ў першай палове дня Палац Незалежнасці — афіцыйная пляцоўка, а затым тут гаспадарыць госці. Гэта добрая традыцыя, якая пачалася з адкрыцця палаца ў 2013 годзе. За гэты час сотні людзей на свае вочы ўбачылі залы, дзе пішацца гісторыя краіны, вырашаюцца важныя палітычныя пытанні, наладжваецца міжнароднае супрацоўніцтва.

Мінская сям'я Свінабаевых прыехала ў палац у поўным складзе — бацькі і пяцёра дзяцей: «Экскурсія выклікае толькі самыя станоўчыя эмоцыі, і мы ганарымся, што ў нашай краіне ёсць такія знакавыя месцы, якія кожны можа наведаць і ўбачыць. Мы захоплены тым, што гэты палац пабудавалі беларусы. Абавязкова будзем расказваць усім, як тут цікава, і будзем раіць наведаць палац».



Розныя залы і дэталі інтэр'еру кожнага экскурсанта ўразілі па-свойму. Але ўсе сышліся на адным меркаванні. Самае цікавае і значнае — тое, што Палац Незалежнасці пабудаваны беларускімі спецыялістамі з беларускіх матэрыялаў. «Адчуваецца, што кожны беларус, які яго ствараў, унёс частку свайго цяпла і сваёй любові. Дзякуй нашым арганізатарам за такое мерапрыемства», — падзялілася Ірына Папіліна.

«Улічваючы, што Мінск быў разбураны падчас вайны, нам неабходны такія пабудовы, як Палац Незалежнасці. Гэта наша спадчына, якую зрабілі беларусы. Палац дэманструе, што наш народ можа ўсё, калі захоча. Абсалютна правільна, што людзі могуць наведаць палац. Мне асабіста было цікава ўбачыць залу, дзе праходзілі перагаворы нармандскай чацвёркі, гэта свайго роду магчымасць дакрануцца да гісторыі», — падкрэсліў Аляксей Гамолка.

Настасся Цішкевіч прыйшла ў Палац Незалежнасці разам з маленькім сынам, які марыць стаць прэзідэнтам і працаваць у Палацы Незалежнасці. Магчыма, для гэтага маленькага хлопчыка наведванне палаца стане першым крокам на шляху да здзяйснення мары.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# З улікам габарытаў і сілы сучасных танкаў

## Унікальны сталічны мост цяпер любую бранятэхніку, што ідзе на парад, вытрымае

**Гэты грандыёзны пуцеправод размешчаны ў Першамайскім раёне Мінска, дзе злучае танкавую аўтамабільную дарогу з боку Уручча (вуліца Старынаўская) з танкавым палігонам. Дадзены пуцепровод перасякае (па верхняй гарызанталі) чыгунку Масква — Мінск на 737-м кіламетры.**

Першапачаткова ён быў пабудаваны ў 1999 годзе і выкарыстоўваўся для руху парадных разлікаў і тэхнікі для трэніроўкі да парадаў войскаў, што праводзяцца ў нашай краіне. Але падчас эксплуатацыі ў канструкцыях гэтага моста з'явіліся дэфекты, якія сталі зніжаць эксплуатацыйныя характарыстыкі і даўгавечнасць збудавання. Таму ўпраўленне капітальнага будаўніцтва Узброеных Сіл нашай краіны стала заказчыкам капітальнага рамонту гэтага пуцепровода. А вось генеральным падрадчыкам (выканаўцам) стала акцыянернае таварыства «Дарбудмантажтрэст», філіял «Будаўніча-мантажны цягнік № 169 на станцыі Віцебск».

Распрацаваным праектам прадугледжаны капітальны рамонт пуцепровода і рэканструкцыя аўтадарогі на ўчастках прымыкання да моста. А на падыходах да яго выконваецца пашырэнне праезнай часткі ад былых 3,2 метра да амаль 5 метраў.

Сярэдні па даўжыні жалезабетонны пуцепровод знаходзіцца на пад'ездзе да вайсковай часці, які адпавядае аўтамабільнай дароз IV катэгорыі. Але вось у чым фокус: перасякальная перашкода — два галоўныя пуці электрыфікаванай чыгункі Масква — Мінск на ўчастку Орша — Мінск, размешчаныя ў выемцы. Трэба было правесці досыць складаныя і энергаёмістыя работы, і ў той жа час ні ў якім разе, ні на хвіліну не прыпыніць адладжаны графік руху цягнікоў на гэтым участку.

Намеснік начальніка аддзела № 1 — дзяржаўны будаўнічы інспектар спецыялізаванай інспекцыі Дэпартамента кантролю і нагляду за будаўніцтвам Васіль Вішнеўскі падкрэсліў, што дзяржаўны будаўнічы нагляд на аб'екце ажыццяўляе менавіта гэтая спецыялізаваная інспекцыя.

Ён адзначыў, што ўсе работы па капітальным рамонце пуцепровода выконваюцца ў строга акрэсленыя часавыя прамежкі — так званыя «вокны». Гэта прадугледжаныя перапынкі ў руху чыгуначнага транспарту, з абавязковым здыманнем напружання з кантактных падвесак і заземленнем на перыяды работы. А напружанне ў кантактнай сетцы на чыгунцы не абы-якое — каля 27 кВ.

Па працягласці самі «вокны» невялікія — да 6 гадзін, таму даводзіцца працаваць у любы час сутак.

Дарэчы, наша чыгунка мяркуе ў перспектыве пабудаваць на гэтым участку трэці пуць. З улікам планавання перспектыўнага трэцяга пуці будаўнікі ў рамках гэтага праекта ўстанавілі маналітную падпорную сценку даўжынёй каля 50 метраў. Яна ўзведзена для захавання апоры № 1 дадзенага пуцепровода.



На гэтым участку запланавана будаўніцтва трэцяга пуці чыгункі.

«Для забеспячэння адпаведнасці сучасным патрабаванням па грузападымальнасці збудавання ўстаноўлена маналітная накладная пліта па маставым палатне. Пры дапамозе гэтай пліты ствараецца неразразанае пралётнае збудаванне. Атрымліваецца так, што маналітная пліта анкерыцца ў плітах існуючых бэлек пры дапамозе спецыяльных стрыжняў. Максімальная таўшчыня такой пліты дасягае 25 сантыметраў», — удакладняе спецыяліст.

Некалькі слоў трэба сказаць аб пакрыцці ездавога палатна. Звычайна на пуцеправодах традыцыйнае пакрыццё — асфальтабетон. Тут жа будзе ўлічвацца той факт, што гэта не проста аўтамабільная дарога, а танкавая аўтамабільная дарога. Таму для забеспячэння надзейнасці і даўгавечнасці самога пакрыцця яно будзе зроблена ў цэментава-бетонным выкананні.

Калі раней максімальная нагрузка на палатно дарогі была да 71 тоны, то цяпер практычна няма абмежаванняў па грузападымальнасці, таму што рэканструяваны пуцепровод вытрымае нагрузку нават каля 112 тон.

Сёння пуцепровод знаходзіцца ў стадыі завяршэння рэканструкцыі. Здаць у эксплуатацыю адрамантаваны мост плануецца ў сярэдзіне красавіка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
8 КРАСАВІКА 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 7 (15906)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Сяргей ДУБЯЛЕВІЧ: «НАСТАЎНІК — ЧАЛАВЕК, З ЯКІМ ЦІКАВА»

**Вы калі-небудзь глядзелі «Што? Дзе? Калі?» па тэлебачанні? Марылі трапіць у эфір ці нават паўдзельнічаць? Я — з самага дзяцінства. Але тады і ўявіць не магла, што калісьці змагу ўжывую пабачыць, а тым больш паразмаўляць з адным са сваіх любімых гульцоў. Па статыстыцы, Сяргей Дубялевіч — самы выніковы член каманды Андрэя Супрановіча. На яго рахунку — Малая і Вялікая Хрустальныя совы, а таксама пад дзясятак званняў найлепшага іграка гульні. Сяргей працуе настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў адной з мінскіх гімназій, трэніруе школьныя каманды па «Што? Дзе? Калі?» і сам гуляў ў адной з найлепшых дарослых каманд краіны. Ён расказаў нам, як растапіць лёд у стасунках з вучнямі, трапіць на тэлебачанне і палюбіць дзяцей па-сапраўднаму.**

## Пра выбар прафесіі

— Не чакаў, што абяру педагогіку, бо я і заікаўся значна мацней, чым зараз, таму недзе гэта перашкаджала камунікаваць. Мы жылі ў прыватным доме: не было такога паняцця, як двор, таму няшмат з іншымі дзецьмі гуляў.

Калі ў дзяцінстве пыталіся, кім хачу стаць, казаў, што вучоным-географам, біёлагам, бо падабаліся кніжкі пра падарожжы, пра іншыя краіны, пра жывёл. А з сярэдняй школы неяк пачалася тэма настаўніцтва. У дзясятым класе пайшоў на профіль «хімія-біялогія», думаў паступаць у медыцынскі ўніверсітэт. Але недзе праз паўгода зразумеў, што не хачу туды ісці. І потым праз алімпіяду паступіў на філфак.

Недзе курсе на трэцім, калі пачаліся спецкурсы і спецсемінары, я зразумеў, што мне нецікавая навука ў адрозненне ад педагогікі, дзе ты бачыш аддачу і вынік. А пісаць навуковыя артыкулы, якія паўтара чалавека будуць чытаць, мне не падабаецца.

У нас была вялікая практыка на пятым курсе ў трэцяй гімназіі. Хадзіў на свае ўрокі, на ўрокі да аднакурснікаў. Ледзь не на ўсіх прадметах пабываў, бо было цікава. Але потым чамусьці размеркаваўся ў Мінскі гарадскі палац дзяцей і моладзі, адпрацаваў там некалькі гадоў.

Вёў «Што? Дзе? Калі?» у школе, а мая ўніверсітэцкая сяброўка там выкладала рускую мову. Потым яна пайшла ў аспірантуру і прапанавала мне сваё месца. Згадзіўся і затрымаўся там амаль на дзесяць гадоў. Добры калектыў, дырэктар, які насамрэч хварэе школай.

Папрацаваў у школе на паўстаўкі, а потым вырашыў, што хачу працаваць на поўную. Адразу і класнае кіраўніцтва ўзяў. Цяжка, адказна, але не шкадую.

## Пра матывацыю вучняў

— Памылкова казаць, што добры настаўнік навучыць любога вучня. Калі той пратэстуе, то яго ні адзін педагог не навучыць. Нават самы геніяльны. Настаўнік можа дапамагчы зразумець, чаго школьнік хоча, даць яму нейкі штуршок. Але сілай веды ў галаву не ўваб'еш. Хтосьці адзнакамі матывуецца, нехта працуе, калі яму цікава, іншы цікавіцца тваёй асобай і імкнецца цябе не расчараваць.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*



Свой выбар

# НАНААЛМАЗЫ І АНТЫМІКРОБНАЯ ТЭРАПІЯ, ці Тарты з пункту гледжання фізікі

**Менавіта такія першыя два кірункі дзейнасці на сваім прафесійным шляху абрала для сябе малады навуковец Анастасія ТАБОЛІЧ — аспірантка фізічнага факультэта БДУ. 25-гадовая дзяўчына 2,5 года працуе малодшым навуковым супрацоўнікам у Інстытуце фізікі Нацыянальнай акадэміі навук. Наша гераіня ўпэўнена, што яе будучыня будзе дакладна звязаная з тым, што захапляе цяпер, а менавіта з навукай і творчасцю. Аб гэтым яна шчыра расказала ў гутарцы з карэспандэнтам «Чырвонкі. Чырвонай змены».**



— У школьныя гады не магла ўявіць, што калісьці буду праводзіць свой час за навуковымі работамі, даследаваннямі, мяне больш прыцягвала творчасць, актыўныя віды спорту, — я прафесійна займалася футболам. Паралельна распрацоўвала дызайн адзення і вывучала мову фарсі (персідскую) пры пасольстве Ірана. Але аднойчы на ўроку геаграфіі нам прапанавалі паўдзельнічаць у алімпіядзе па астраноміі. Падумала, чаму б і не? Заняла першае месца на гарадскім этапе, з'явіўся азарт, таму прадоўжыла далей займацца гэтым. Удзельнічала ў розных конкурсах, канферэнцыях і мерапрыемствах. Напрыклад, у конкурсе «Адысей, я і космас». Ён праводзіўся ў Прэзідыуме Акадэміі навук, больш за шэсць гадзін мы слухалі даклады ўдзельнікаў, гэта было вельмі захапляльна. Маю работу высока ацанілі і прапанавалі выступіць на міжнародным узроўні. Яе пераклалі на англійскую мову і адправілі ў Брусель на ацэнку экспертаў, якія працавалі ў вядучых універсітэтах Еўропы. Калі надышоў час паступлення, даведалася, што работу ацанілі як адну з найлепшых сярод усіх прадстаўнікоў СНД, гэта было вельмі нечакана і прыемна. Калі прыйшоў час паступаць, падала дакументы на інжынера-дызайнера ў БНТУ, аднак у апошні момант перадумала і паступіла на фізічны факультэт БДУ. Аб гэтым нікольки не пашкадавала.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Прастора для рэлаксу

# РАЗЕЛЫ, КАКАРЫКІ І КАРЭЛЫ, альбо Добры настрой, прынесены ў дзюбе

**Пагрузіцца ў атмасферу тропікаў і атрымаць асалоду ад кампаніі экзатычных птушак цяпер можна не выязджаючы з Мінска, бо ў горадзе адкрылася другая ў Беларусі «Папугайня». Гэта не проста вальер з папугаямі, а цэлы птушнік, дзе размясціліся больш за тры сотні яркіх насельнікаў, на якіх можна не толькі глядзець, але і ўсяляк узаемадзейнічаць з імі. Мы пабывалі ў гэтым незвычайным месцы і пагаварылі з адной з яго саўладальніц Мартай КАРАБКОВАЙ.**

По адукацыі наша гераіня праграміст, і яшчэ некалькі гадоў таму нават не думала аб адкрыцці свайго бізнесу, тым больш такога незвычайнага. Аднак лёс распарадзіўся інакш. Аднойчы Марта наведала кантактны заапарк, які стаў зыходным пунктам яе будучых праектаў.



— Мне вельмі спадабалася канцэпцыя такіх устаноў, але разумела, што калі абдумаць некаторыя моманты, то ўсё можна рэалізаваць яшчэ лепш. Я падзялілася думкамі са сваім мужам, і ён прапанаваў адкрыць уласны кантактны заапарк. Пасля яго мы вырашылі не спыняцца і, аналізуючы вопыт замежных краін, прыйшлі да высновы, што ніхто ў нас не рэалізаваў такую ідэю, як «Папугайня» — птушнік, у якім жывуць толькі папугаі розных відаў. Нам спадабаўся гэты кірунак, таму, нядоўга думаючы, пачалі распрацоўваць праект.

Першая «Папугайня» з'явілася ў Гродне, але з-за каранавіруса ледзь не пацярпела фіяска. Паспяхова абмінуўшы гэтую праблему (распіярыўшы праект у сродках масавай інфармацыі і стварыўшы фонд у яго падтрымку), Марта са сваімі калегамі вырашыла развівацца і адкрыла другую такую ўстанову ў Мінску.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

На слыху

# МАЛЕНЬКІМІ КРОКАМІ — ДА ШКОЛЫ БЕЗ БУЛІНГУ,

## або Чаму мы талерантныя да цкавання?

**Пачатак навучальнага года. У мінскай школе з'яўляецца навічок, які прыехаў у сталіцу з райцэнтра. Літаральна з першых хвілін ён становіцца аб'ектам насмешак і здзекаў з боку сваіх аднакласнікаў... Знаёмая сітуацыя, праўда? Асабліва для тых, каму ў школьныя гады даводзілася змяніць навучальную ўстанову. Хтосьці з дарослых сам быў калісьці ахвярай школьнага булінгу, хтосьці — агрэсарам, але большасць займалі месца ў "глядзельнай зале" і былі пасіўнымі назіральнікамі. Спачувалі, але ўмешвацца не вырашаліся, бо была пагроза самім апынуцца на месцы ахвяры. Калі б можна было вярнуцца назад і ўсё змяніць... Але машыну часу пакуль не вынайшлі, таму нашы маральныя пакуты мала каго сёння цікавяць. Ці ўсё ж такі можна нешта змяніць?**

### ЗРАБІ СВОЙ ВЫБАР

Падчас канферэнцыі «Школа без булінгу» адбылася прэзентацыя інтэрактыўнага фільма «Ізгой», знятага КінаШколай-студыяй Андрэя Палупанава па заказе інфармацыйна-кансультацыйнай установы падтрымкі настаўніцкіх ініцыятыў «ЭдКэмп». У анатацыі да фільма гледачоў папярэджваюць: «Разумна падыходзьце да выбару дзеянняў. Памятайце, што ад кожнага вашага кроку будзе залежаць жыццё чалавека». На працягу фільма яны неаднаразова будуць стаяць перад выбарам і галасаваць. Сюжэт далей развіваецца ў залежнасці ад таго, які з прапанаваных варыянтаў быў абраны. Таму ў фільма тры розныя фіналы. Ці здолее навічок уліцца ў новы калектыў і якой цаной? Гэта вырашаць гледачам...

Вядома, у кожнага, хто сутыкаўся з булінгам, свая гісторыя і свая псіхічная траўма. Раней лічылася, што цкаванне пачынаецца, калі прыходзіць вучань, які рэзка адрозніваецца ад усёй астатняй групы, і тая, каб захаваць сваю цэласнасць, пачынае яго выганяць. Але цкаваць могуць і актыўных, таварыскіх дзяцей. Асабліва дастаецца выдатнікам-«батанікам». Праблема не ў канкрэтным вучні, а ў тым, што так паводзіць сябе з аднакласнікамі лічыцца дапушчальным. А яшчэ ёсць меркаванне, што булінг, як і крызісныя сітуацыі, з'яўляецца неад'емнай часткай сталення, што гэта «школа жыцця», таму падлеткам неабходна спраўляцца з гэтым самастойна. У рэальнасці толькі для вельмі моцнай асобы булінг можа стаць прычынай для росту, ад якой ён адштурхнецца і пойдзе далей. А большасць з тых, каго ў дзяцінстве цкавалі, у будучыні не раскрываюць свой патэнцыял, у іх заніжана самаацэнка, яны больш схільныя ў маладым узросце да суіцыдаў, трывожных расстройстваў і дэпрэсій.

— Я пастаянна займаюся наступствамі булінгу і хачу заўважыць, што ў кожным агрэсіўным дзіцяці ёсць вялікая колькасць нерэалізаваных патрэб, — разважае **Андрэй ШАБАНАЎ, псіхолаг, трэнер, кіраўнік развіццёвага цэнтра для дзяцей і падлеткаў «Смялей».** — На мой погляд, імкненне школы да стандартызацыі не дае дзецям магчымасці цалкам сябе рэалізаваць і штурхае іх да «неэкалагічных паводзін». Яшчэ адно маё назіранне: ахвяры агрэсіі — гэта, як правіла, добра выхаваныя дзеці, якіх бацькі з ранняга дзяцінства рабілі «зручнымі». Прыходзіць да мяне 16-гадовы падлетак, які ведае дзве замежныя мовы, гуляе ў шахматы, займаецца плаваннем, а ты бачыш перад сабой «выдрэсіраваную мадэль», без уласных памкненняў. Задача бацькоў — стварэнне ўмоў для выхавання асобы, а мы імкнёмся абараніць іх ад усяго, што толькі магчыма, і ўсё вырашаем за іх.

Прыклад такой маці, якая таксама паспрыяла булінгу свайго дзіцяці, якраз і быў прадэманстраваны ў інтэрактыўным фільме «Ізгой».

### РОЗНЫЯ «АДЦЕННІ»

— Не варта блытаць агрэсію з булінгам, — папярэджвае **старшы выкладчык БДПУ імя М. Танка, навуковы супрацоўнік РНПЦ псіхічнага здароўя Наталля ГРЭБЕНЬ.** — Агрэсія — не заўсёды булінг. Гэта вельмі важны механізм абароны чалавека, адстойвання ім сваёй пазіцыі, свайго «я», і яна жыццёва неабходная. Нельга адносіць усе ахоўныя рэакцыі, якія не датычацца цкавання іншага чалавека, да булінгу. Агрэсія — ненаўмысная рэакцыя, напрыклад, на тое, што хтосьці парушыў тваё асабістыя межы, а булінг — заўсёды наўмыснае прычыненне шкоды іншаму чалавеку, прычым гэта не аднаразовая з'ява, а рэгулярная і можа доўжыцца месяцамі.

Наталля Грэбень каля шасці гадоў вывучае сітуацыю з булінгам у беларускіх школах. Яна падзялілася вынікамі свайго даследавання, якое ахапіла каля 150 вучняў мінскіх школ. Даследаванне рэалізоўвалася з пазіцыі ахвяры, а не агрэсара ці назіральніка, таму што калі чалавеку дрэнна, то ён будзе пра гэта казаць. Зусім невялікая колькасць адбракаваных анкет сведчыць якраз пра тое, што гэтая тэма неабыякавая для школьнікаў.

Пасля апрацоўкі даных атрымаліся наступныя вынікі: 68 працэнтаў падлеткаў звеедваюць булінг час ад часу, 17 працэнтаў — ніколі, а 14 працэнтаў — пастаянна. Дарэчы, хлопчыкаў часцей падвяргаюць сацыяльнай ізаляцыі і выключэнню з групы.

— Вывучаліся найбольш распаўсюджаныя прыкметы булінгу, — кажа Наталля Грэбень. — «Калі я іду ў школу, мне неспакойна», — так адказалі 75 працэнтаў школьнікаў. «Былі выпадкі, калі аднакласнікі псавалі мае асабістыя рэчы (71 працэнт). «Перад школай у мяне штосьці баліць, я адчуваю сябе дрэнна» (67 працэнтаў). «У класе я адчуваю сябе напружана» (65 працэнтаў). «Былі сітуацыі, калі я адчуваў нянавісць з боку аднакласнікаў» (64 працэнта). «Некаторыя аднакласнікі звяртаюцца да мяне, выкарыстоўваючы мянушку» (63,5 працэнта), «....могуць мяне штурхнуць ці ўдарыць» (58 працэнтаў).

— У булінгу шмат адценняў, — заўважае Наталля Грэбень. — **Падлетак можа адчуваць агіду, пагардлівасць у адносінах да аднакласніка. Гэта іншая эмоцыя, але яна — таксама праява булінгу.** А вось выкарыстанне мянушкі можа быць і не абразай, а толькі элементам субкультуры: усё залежыць ад таго, як ставіцца да яе падлетак, ці выклікае яна ў яго эмацыянальныя перажыванні.



### МАЎКЛІВЫЯ СВЕДКІ

**Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Юлія НЕКРАШ** падзялілася адным з прыёмаў, які яна выкарыстоўвае ў рабоце са сваімі вучнямі. Прызналася, што калі ўзяла класнае кіраўніцтва, то сама непасрэдна на практыцы сутыкнулася з булінгам:

— Я прыношу на класную гадзіну кошык з яблыкамі. Іх роўна столькі, колькі вучняў у класе, плюс адзін «зверху». Выбіраю адвольна яблык, прапаную дзецям знайсці ў ім недахопы (ты занадта кіслы, не маеш водару, у цябе шмат плямак і гэтак далей) і сказаць яму пра гэта. Можна не толькі сказаць, але і тыцнуць алоўкам ці сціснуць. Пасля таго як яблык вяртаецца да мяне, кладу яго ў кошык. Дзякую вучням за гульню і частую іх садавінай з каша, даючы магчымасць самім выбіраць. Практыка паказвае, што «паранены» яблык застаецца апошнім (усе яго ігнаруюць), і гэта служыць асновай для далейшых размоў на тэму булінгу. А калі б на месцы яблыка апынуўся чалавек? Між іншым, булінг у гэтай сітуацыі фактычна запусціў настаўнік. Але мала хто з дзяцей адмаўляецца «пакрыўдзіць» таго, хто нічога дрэннага табе не зрабіў. Усе або ўдзельнічаюць у цкаванні, або з'яўляюцца маўклівымі сведкамі...

«Трэба перастаць казаць пра булінг як пра анамальныя адзінкавыя выпадкі. Цкаванне — вельмі распаўсюджаная з'ява ў школе, проста многія замоўчваюць гэтую праблему, — кажа настаўніца. — Па ацэнках еўрапейскіх даследчыкаў, у ролі ахвяр цкаванняў у розныя перыяды свайго жыцця пабывалі 50 працэнтаў дзяцей, а 10—15 працэнтаў школьнікаў знаходзяцца ў гэтай сітуацыі ў дадзены момант. Кожны дзень яны ідуць у школу як на пакаранне. А мы хочам іх чамусьці навучыць у той час, як яны занятыя выжываннем. Часцей за ўсё, калі даводзіцца ўсё ж такі неяк рэагаваць на факты булінгу, мы шукаем вінаватага, рыхтуем справаздачу аб прынятых мерах (як і каго пакаралі) і... закрываем пытанне. Наша грамадства вельмі талерантнае да цкавання...»

Дарэчы, як вы думаеце, хто ведае больш за ўсіх у школе пра тое, што кагосьці з дзяцей цкуюць? Гэта тэхнічныя работнікі: яны бачаць дзяцей па-за ўрокамі, у сталовай, гардэробе, на калідорах і гэтак далей, але педагогі рэдка цікавяцца іх меркаваннем.

### НОВЫЯ ЛІДАРЫ

— Калі школьнік, якога цкуюць, шукае дапамогі ў настаўніка, гэта можна лічыць вялікай удачай, таму што дзеці не схільныя звяртацца па дапамогу да дарослых, рызыкаваць сваім аўтарытэтам — ты быццам бы распісваешся ва ўласнай бездапаможнасці, — падкрэслівае **кіраўнік Гарадскога навуковага таварыства навучэнцаў на базе Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі Аляксандр СЦЕПУЛЁНАК.** — Але, на жаль, настаўнікі часта самі не ведаюць, як выйсці з сітуацыі. А дзеці, як правіла, транслююць у школьным калектыве тыя мадэлі паводзін, што ёсць у іх сям'і. Шмат залежыць ад стылю выхавання: аўтарытарны ён ці дэмакратычны? Заўважана, што часта аб'ектамі цкавання становяцца хлопчыкі, маці якіх праяўляюць гіперапеку, і дзяўчаты, у якіх, наадварот, халодныя адносіны з маці. Калі бацька ў сям'і — агрэсар, дзеці паўтараюць яго ролю ў школе. Сацыяльная няроўнасць таксама, на жаль, мае месца і з'яўляецца прычынай цкавання.

Аляксандр Сцепулёнак расказаў, што **існуюць мабільныя праграмы, накіраваныя на папярэджванне булінгу. Адна з самых вядомых і адзначаных узнагародамі — ReThink.** Гэта інавацыйная, ненадакучлівая, запатэнтаваная тэхналогія, якая эфектыўна выяўляе і спыняе нянавісць у інтэрнэце, перш чым будзе нанесена шкода. Замяніўшы сабой клавіятуру на мабільнай прыладзе, ReThink «прысутнічае» ва ўсіх дадатках (ад тэкставых праграм і пошты да месенджараў і сацыяльных сетак) для выяўлення там абразлівых паведамленняў у рэжыме рэальнага часу. Фактычна гэты дадатак дапамагае ўтаймаваць імпульсіўныя паводзіны падлеткаў і страхуе ўладальніка гаджэта ад учынку, пра які ён можа пазней пашкадаваць. Калі хтосьці пачынае пісаць штосьці абразлівае (а ў праграме ўтрымліваецца «архіў» усялякіх абраз), на экране з'яўляецца акенца з прапановай «Пачакай! Ты ўпэўнены, што хочаш адправіць гэта паведамленне?» Як паказала даследаванне, больш як 93 працэнты аўтараў спыняюцца на этапе мадэрацыі.

Распрацавала мабільную праграму 13-гадовая Трыша Прабху (сёння выпускніца і сацыяльны прадпрымальнік ужо навучаецца ў Гарвардскім каледжы). Як і многія сучасныя маладыя людзі, Трыша таксама стала ахвярай кіберзапужвання. А калі яна прачытала ў СМІ трагічную гісторыю маладой дзяўчыны, якая загінула ў выніку самагубства пасля кіберздзекаў, узялася за справу — пачала шукаць эфектыўнае папераджальнае вырашэнне праблемы анлайн-нянавісці. Так з'явілася мабільная праграма ReThink, якая ахапіла 5,5 мільёна навучэнцаў з 1,5 тысячы школ па ўсім свеце. Яе спампавалі больш як 500 тысяч разоў. Зараз праграма даступная на шасці мовах, але, на жаль, рускай мовы пакуль няма. Аляксандр Сцепулёнак прапануе стварыць каманду, каб зрабіць яе рускамоўную версію.

Сёння ReThink — больш, чым проста тэхналагічны прадукт. Гэта рух, заклік да дзеяння, штуршок да спынення нянавісці ў інтэрнэце і выхавання адказных лічбавых грамадзян. А Трыша Прабху з'яўляецца паслом руху супраць запужвання ў сеціве і правяла больш як 50 выступленняў у 30 гарадах.

Дарэчы, амерыканскі часопіс Time, які штогод абірае «Чалавека года», у 2020-м стварыў новую катэгорыю «Дзіця года». У агульнай складанасці за гэта званне змагаліся больш за пяць тысяч прэтэндэнтаў, з якіх адабралі пяць фіналістаў, а перамагла 15-гадовая даследчыца ў сферы высокіх тэхналогій Гітанджалі Раа са штата Каларада. Гэтага гонару дзяўчына ўдастоілася за ўменне прымяняць інавацыйныя навуковыя ідэі ў вырашэнні рэальных праблем і матывацыю іншых падлеткаў. У прыватнасці, Гітанджалі стварыла браўзернае пашырэнне Kindly, здольнае распазнаць цкаванне ў інтэрнэце, а таксама тэхналогію выяўлення свінцу ў пітной вадзе. На думку Time, намінацыя «Дзіця года» павінна служыць «барометрам для ацэньвання новых лідараў самага маладога пакалення Амерыкі».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

У ліку найлепшых

# «БМВ» з дапоўненай рэальнасцю

**Адным з пераможцаў рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі» стала распрацоўка «Адукацыйная платформа БМВ». Сталічныя школьнікі Максім Сувораў і Аляксандр Мяльгуй, вучні сярэдняй школы № 111, перамаглі ў намінацыі «Інфармацыйна-камунікацыйныя і авіякасмічныя тэхналогіі».**




**Злева направа: кіраўнік праекта Мікалай Юр'евіч Курыловіч, Максім Сувораў, Аляксандр Мяльгуй.**

На стварэнне платформы хлопцаў падштурхнула праблема каранавіруса, калі ў 2020 годзе многія вучні адзінаццатага класа так і не змаглі якасна падрыхтавацца да ЦТ.

Хлопцы прааналізавалі літаратурныя крыніцы па камп'ютарнай лінгвістыцы ў Нацыянальнай бібліятэцы і базу «Адзінага інфармацыйна-адукацыйнага рэсурсу», дзе так і не знайшлі заданняў па беларускай мове.

Адукацыйная платформа «БМВ» (што тлумачыцца як «Беларуская мова вучням») створана на мовах C sharp і Kotlin. Яе сутнасць заключаецца ў дыстанцыйным абмене паведамленнямі паміж вучнямі і настаўнікамі, што дапамагае трымаць кантакт і паўнавартасна працягваць навучанне. Інавацыйнасць распрацоўкі ў тым, што яна дазваляе навучэнцам замацоўваць свае веды не толькі праз камунікацыю з выкладчыкамі, але і з дапамогай сямі аўтарскіх дадаткаў, убудаваных непасрэдна ў платформу, якія змяшчаюць элементы дапоўненай рэальнасці.

Карыстацца такой платформай можна на любым уроку — у яе аснове ёсць усе раздзелы мовазнаўства.

Прапанаваныя дадаткі ўжо прайшлі апрабацыю сярод навучэнцаў сталічнай сярэдняй школы № 111. Адукацыйная платформа паказала сябе як эфектыўная і карысная не толькі для вучняў, але і для студэнтаў першага ці другога курсаў.

**Ягор ДУЛЕВІЧ, вучань 11 класа СШ № 111 г. Мінска.**

На хвалі часу

# ГАДЫ МАЛАДЫЯ — КАМСАМОЛЬСКІЯ!

**Днямі ў Мінску ў Цэнтральным камітэце Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі прайшло віншаванне са знакавым юбілеем — 90-годдзем легендарнага камсамольскага лідара 60-х Рэўміры Сяргееўны Піёнавай.**

Цырымонія адбылася ў фармаце шчырай размовы за душах за кубкам гарбаты, з успамінамі пра камсамольскую маладосць у коле ветэранаў гэтага руху і маладых сучаснікаў. Для галоўнай гераіні мерапрыемства былі падрыхтаваны прыемныя сюрпрызы і віншаванні.

Рэўміра Сяргееўна заўсёды адзначала, што работа ў камсамоле — яркая старонка ў жыцці. Яна стаяла каля вытокаў студатрадаўскага руху Беларусі, была ініцыятарам будаўніцтва Рэспубліканскага піянерскага лагера «Зубраня» (цяпер — Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня»). У свой час з'яўлялася сакратаром Цэнтральнага камітэта Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі, старшынёй Цэнтральнага савета Беларускай піянерскай арганізацыі. Яна — выдатны педагог, прафесар, доктар педагагічных навук. За поспехі ў працоўнай дзейнасці Рэўміра Сяргееўна была ўзнагароджана ордэнам «Знак пашаны», пяцікратна — дзяржаўнымі медалямі шэсць разоў — Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

У свае 90 гадоў — навуковы кіраўнік аспірантаў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Рэўміра Сяргееўна і сёння часта наведвае розныя сустрэчы з маладым пакаленнем, знакавыя мерапрыемствы, каб паказаць ім дастойны прыклад. Напрыклад, у сакавіку бягучага года яна стала ўдзельніцай інтэрнэт-праекта БРСМ «Жанчыны-легенды», што яшчэ раз пацвярджае маладосць яе душы.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Акордамі душы

# Прыгадаць вучобу ў alma mater

**Флэшмоб «Любімая фатаграфія ў студэнцкія гады» праходзіць у сацыяльных сетках БДУ.**

Акцыя прымеркавана да 100-гадовага юбілею ўніверсітэта і скіравана на аб'яднанне выпускнікоў розных гадоў і стварэнне ўнікальнай фотакалекцыі студэнцкага жыцця.

Да ўдзелу запрашаюцца ўсе ахвотныя, месцам вучобы якіх стаў БДУ. Для гэтага неабходна апублікаваць свае фатаграфіі часоў студэнцтва ў сацыяльных сетках «УКантакце», «Інстраграм» і «Фэйсбук» з хэштэгам #БГУ100лет. Гэта могуць быць здымкі з навучальных заняткаў, мерапрыемстваў, выпускных вечароў або іншых памятных падзей. Пажадана пазначыць год выпуску, назву факультэта і падзею. Самыя цікавыя па змесце фатаграфіі будуць апублікаваныя на афіцыйных старонках сацыяльных сетак БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Лакацыі актыўнасці

# ПАСАДЗІ СВАЁ ІМЯННОЕ ДРЭВА

**У Беларусі вясной закладуць больш за 80 паркаў і алей сямейных дрэў. Усё гэта — дзякуючы рэспубліканскаму праекту «Парк сямейных дрэў», падчас якога можна пасадзіць сваё імяннае дрэва ў гонар важнай падзеі ў сям'і. Акрамя таго, сем'і працягнуць даглядаць высаджаныя раней саджанцы.**

Увесну плануецца пасадзіць восем паркаў, тры скверы і 71 алею сямейных дрэў. Напрыклад, 17 красавіка напярэдадні Міжнароднага дня Зямлі плануецца заснаваць парк сямейных дрэў у гарадскім пасёлку Арэхаўск Аршанскага раёна. Напрыканцы сакавіка сем'і пагранічнікаў залажылі ў гонар загінулых у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны алею сямейных дрэў у вёсцы Чылеева Брэсцкага раёна. 20 красавіка парк сямейных дрэў з'явіцца ў Навагрудку. 22 красавіка ў мікраараёне Касцюкоўка ў Гомелі алею сямейных дрэў пасадзяць маладыя сем'і, работнікі «Гомельшкла». Каля кожнага дрэва будзе ўстаноўлена спецыяльная шыльда з прозвішчам сям'і і датай пасадкі.

Рэспубліканскі праект «Парк сямейных дрэў» рэалізуецца з 2019 года БРСМ у цесным узаемадзеянні з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, аблвыканкамамі, іншымі зацікаўленымі структурамі. Праект скіраваны на ўмацаванне інстытута сям'і і традыцыйных сямейных каштоўнасцей як фактару нацыянальнай бяспекі краіны. У 2019—2020 гадах у Беларусі закладзена больш за 200 сямейных паркаў, скавераў, алей.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Паставім эксперымент

# ПАНАЗІРАЦЬ ЗА ПТУШЫНЫМІ ЎВЕСНУ

**«Ахова птушак Бацькаўшчыны» абвясціла конкурс малюнкаў «Які мой дом?» Акцыя праводзіцца ў рамках міжнароднай кампаніі «Жывая вясна». Да ўдзелу ў ёй запрашаюцца дзеці і падлеткі да 16 гадоў.**

Кожны год птушкі вяртаюцца з зімоўкі, каб загнездавацца і вывесці птушанят. Хтосьці будуе новае гняздо, хтосьці вяртаецца ў старое і робіць «рамонт», а хтосьці займае гнездзе, зробленыя чалавекам. Праз некаторы час у птушыным доме робіцца больш цесна, бо з'яўляюцца новыя члены сям'і — маленькія птушаняты.

Дзецям прапаноўваюць намаляваць гняздо любой беларускай птушкі з яго насельнікамі: гаспадыняй або цэлай птушынай сям'ёй.

— Звярніце ўвагу на дрэвы побач са сваім домам: магчыма, там поўным ходам птушка будуе ці ўжо пабудавала сваё гняздо, — раіць **спецыяліст грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Анастасія ПЯРКО.** — Не прапусціце шанц паназіраць за сваімі суседзямі...

Фота або скан малюнка трэба даслаць на паштовую скрыню springalive@ptushki.org з пазнакай «Які мой дом?» да 15 мая ўключна. Вынікі будуць падведзены 20 мая і з'явяцца на сайце АПБ. Тры аўтары найлепшых малюнкаў атрымаюць прызы.

Кампанія «Жывая вясна» стартавала ў 2006 годзе як еўрапейскі праект BirdLife International. З 2009 года да яго далучыліся краіны Цэнтральнай Азіі, а з 2010 года «Жывая вясна» прыйшла ў Афрыку. Летась на сайт «Жывой вясны» паступіла 11669 назіранняў ад удзельнікаў з Еўропы, Цэнтральнай Азіі і Афрыкі. Дзякуючы актыўнаму ўдзелу беларусаў наша краіна апынулася на другім месцы сярод 59 краін-удзельніц.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ
РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«День кошек»

**Сведения об организаторе:**
Белорусско-эстонское совместное предприятие «ПРАЙМЭРИ» общество с ограниченной ответственностью с местом нахождения по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2. УНП 101132766.
**Наименование Рекламной игры:**
«День кошек»
**Срок начала и окончания Рекламной игры:**
Срок начала Рекламной игры – 01 марта 2021 года;
Срок окончания Рекламной игры – 16 апреля 2021 года.
**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:**
Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 22 февраля 2021 года, свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3942.
**Сведения о количестве участников рекламной игры:**
В Рекламной игре приняло участие 1 474 человек.
**Сведения о розыгрыше призового фонда:**
Призовой фонд Рекламной игры разыгран полностью.
**Сведения о победителях и их выигрышах:**
Фамилии и инициалы победителей с указанием их выигрышей размещены на сайте www.whiskas-promo.by в глобальной компьютерной сети Интернет.
**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры:** +375 17 239 06 20.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский шпалопропиточный завод» (продавец)**
**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ**
**КОСИЛКИ ОТКОСОВ КАНАЛОВ К-78М,**
**2014 года выпуска, монтируемой к МТЗ-80, МТЗ-82 и другим модификациям, гидравлической с рабочей скоростью 05,-5,0 км/ч, производительностью 0,3 га/ч, с числом оборотов 540-560 об/мин, массой 820 кг, инв. № 041380, зав. № 319, изготовитель – ОАО «Кохановский экскаваторный завод», Республика Беларусь, расположенной по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Сенная, 5.**
Начальная цена с НДС 20 % – **4 317,96** бел. руб. *Начальная цена снижена на 52,4 %.* Задаток 10 % от начальной цены (**431,79** бел. руб.).
**Задатки перечисляются на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBANBPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 17.07.2020. Аукцион состоится **04.05.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.05.2021** до **16.00** по указанному адресу.
**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 8 (029) 102-21-17.**
**Телефон для осмотра: 044 549 44 14.**
УНП 600012389

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению районного унитарного предприятия «Любанское ЖКХ» (продавец)**
**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**
**ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ**
**с инв. № 643/D-5408 (наименование – административное помещение с тамбуром), общей площадью 178,4 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, г. Любань, ул. Первомайская, 45 А-1, сведения о земельном участке: кадастровый номер 623450100001003170, площадь 0,0532 га, право общей долевой аренды.**
**Начальная цена без НДС – 57 600,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **5 760,00** бел. руб.
**Задаток перечисляется на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**
Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.
Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by.
Аукцион состоится **12.05.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.05.2021** до **16.00** по указанному адресу.
**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 8 (029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (01794) 68 706, 8 (029) 195 05 55.**
УНП 600208822

УНП 200075434
**ОАО «Белсолод»**
*(ул. Полевая, 32, г. Иваново Брестской области)*
**объявляет о выплате дивидендов за 2020 год в размере 0,0018512746 рубля на 1 акцию.**
Срок выплаты: до 24.05.2021.
Порядок выплаты: путем перечисления через отделения РУП «Белпочта».
Зачисление на банковские счета, выплата дивидендов через кассу общества осуществляются по заявлению Акционера.

Кропка адліку

# Эфектыўная экасістэма для маладых даследчыкаў

**Беларусь прапануе падрыхтаваць маладзёжную навукова-тэхнічную праграму Саюзнай дзяржавы.**

Для ўключэння моладзі ў навуковую дзейнасць наша краіна ініцыявала стварэнне маладзёжнай навукова-тэхнічнай праграмы Саюзнай дзяржавы. Пра гэта паведаміў на ўрачыстым сходзе, прысвечаным Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, **кіраўнік Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр ШУМІЛІН.** Паводле яго слоў, такая праграма можа быць створана пад эгідай Савета маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і БРСМ. Акрамя таго, для лепшага разумення працэсаў фінансавай падтрымкі праектаў прапануецца ўключыць дзве-тры кандыдатуры з ліку маладых даследчыкаў у склад Камісіі па фарміраванні адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Саюзнай дзяржавы.

«У рамках Саюзнай дзяржавы мы імкнёмся стварыць эфектыўную экасістэму, у якой усе ўдзельнікі змаглі б павышаць сваю кваліфікацыю, праводзіць сумесныя даследаванні, выйграваць гранты і абменьвацца ідэямі. Тым не менш нам неабходна прыкладаць усе намаганні, каб дапамагчы маладым даследчыкам выразна ўбачыць траекторыю развіцця і прапанаваць найлепшыя ўмовы для поўнай рэалізацыі творчага, навуковага, чалавечага і інавацыйнага патэнцыялу маладых людзей», — падкрэсліў Аляксандр Шумілін. Ён таксама паведаміў, што ў цяперашні час Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях і Міністэрства навукі і вышэйшай адукацыі Расійскай Федэрацыі абмяркоўваюць перспектывы выдзялення грантаў маладым навукоўцам для праходжання стажыровак у самых прэстыжных ВНУ і акадэмічных навукова-даследчых інстытутах Расіі і Беларусі.

Нашы краіны праводзяць штогод дзясяткі мерапрыемстваў па розных напрамках супрацоўніцтва, у тым ліку ў сферы навукова-тэхнічнага ўзаемадзеяння, якое з'яўляецца адным з ключавых у справе саюзнай інтэграцыі. Дарэчы, за гады будаўніцтва Саюзнай дзяржавы рэалізаваны і працягваюць выконвацца дзясяткі сумесных навукова-тэхнічных праграм. Многія распрацоўкі ўжо паспелі атрымаць міжнароднае прызнанне.

У 2020 годзе рэалізоўвалася сем навукова-тэхнічных праграм Саюзнай дзяржавы.

У бягучым годзе працягваецца рэалізацыя праграм «Развіццё сістэмы гідраметэаралагічнай бяспекі Саюзнай дзяржавы», «ДНК-ідэнтыфікацыя», «Камбікорм-СД», «Інтэграцыя-СД».

У цяперашні час у распрацоўцы знаходзіцца цэлы шэраг новых праектаў канцэпцый праграм, шэсць з якіх — у высокай ступені гатоўнасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# НАНААЛМАЗЫ І АНТЫМІКРОБНАЯ ТЭРАПІЯ...

***(Заканчэнне.***
***Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Анастасія прызналася, што першы год вучобы быў напружаны: амаль уся група студэнтаў складалася з алімпіяднікаў, і таму часам схапіць усё на ляту было няпроста. «Але аднагрупнікі былі выдатныя!», — дадае яна.

— Адразу ведала, на якую кафедру хачу трапіць, — лазернай фізікі. Мой дзядуля займаўся даследаваннямі лазераў, вывучаў магнітныя ўласцівасці, таму асабісты шлях быў вызначаны. З таго моманту пачаўся час навуковых эксперыментаў і адкрыццяў. Спачатку з кіраўніком займаліся лазернымі тэхналогіямі, глядзелі, як насычаецца кроў кіслародам пры ўздзеянні выпраменьвання. Гэта было вельмі цікава. Уздзейнічалі не толькі лазерам на пэўныя зоны, але і магнітам, які таксама вядомы сваімі ўласцівасцямі ўплываць на кроў, каб зняць боль. Потым пачала займацца нанаалмазамі, або ўльтрадысперснымі алмазамі.

Гэта адходы ваеннай прамысловасці, якія атрымліваюцца пры ўтылізацыі боеприпасаў шляхам выбуху. Іх можна выкарыстоўваць, бо яны не вызначаюцца канцэрагеннымі ці мутагеннымі ўласцівасцямі, іншымі словамі, нетаксічныя. Іх прымяняюць у тэхніцы, у прыватнасці, гальваніцы, змазачных матэрыялах, абразіўных інструментах, а таксама ў сістэмах магнітнага запісу. У практычным выкарыстанні ўльтрадысперсныя алмазы застаюцца аднымі з найбольш перспектыўных. Гэта абумоўліваецца адносна нізкім коштам і маштабнасцю вытворчасці ў спалучэнні з іх выдатнымі фізічнымі характарыстыкамі: малы памер і вялікая актыўная паверхня



часціц, патэнцыяльная магчымасць кіравання яе функцыянальным складам. «Ужо цяпер у абсяг маіх навуковых інтарэсаў уваходзіць распрацоўка лазернай антымікробнай тэрапіі. Яна прымяняецца ў стаматалогіі, пры лячэнні хвароб поласці рота, страўніка, анкалогіі і іншых захворванняў», — дадала Насця.

На сёння адной з найбольш сур'ёзных пагроз для здароўя чалавецтва і харчовай бяспекі Сусветная арганізацыя аховы здароўя называе ўстойлівасць хваробатворных мікраарганізмаў да антыбіётыкаў. Эксперты канстатуюць: калі не прыняць неадкладныя меры, на нас пачне насоўвацца постантыбіятычная эра, калі распаўсюджаныя інфекцыі і нязначныя траўмы зноў могуць стаць смяротнымі. Даследчыкі і ўрачы практычнай медыцыны актыўна ўключыліся ў пошук сродкаў, якія дазваляюць прадухіліць такую пагрозу. Свой арыгінальны спосаб барацьбы з хваробатворнымі мікраарганізмамі — уздзейнічаць на патагенную флору выпраменьваннем святла бачнай зоны спектра — і прапаноўваюць сёння навукоўцы.

— Як працуе лазерная тэрапія ў тэорыі: трэба выпіць таблетку, пачакаць — і спецыяльны прыбор выявіць, дзе назапасіліся бактэрыі, якія выклікаюць паражэнні. Мы разглядаем асноўныя штамы бактэрый стафілакока, бактэрыі страўнікава-кішачнага тракта і грыбковыя паражэнні. Чаму кажу «ў тэорыі», таму што спачатку трэба закончыць эксперыментальную частку, — зараз мы працуем з прабіркамі, пасля можна будзе праводзіць выпрабаванні на жывёлах, а яшчэ пазней — намагацца ўводзіць доказную базу ў клінічнай практыцы, гэта значыць, на людзях. У мяне яшчэ тры-чатыры гады сыдзе на даследаванне, планую абараніць кандыдацкую дысертацыю па дадзенай тэме. І для мяне важна, каб гэта не завісла ў паветры, а каб быў канкрэтны прадукт, які мы зможам прымяніць на практыцы.

Анастасія ўваходзіць у Савет маладых навукоўцаў свайго ўніверсітэта. Супольнасць займаецца тым, што арганізоўвае мерапрыемствы, звязаныя з навуковай дзейнасцю, цікавыя сустрэчы, трэнінгі на розныя тэмы: як удала прэзентаваць свае ідэі, развіць камунікатыўныя навыкі, наладзіць кантакт з міжнароднымі навукоўцамі... «Я цесна камунікую са студэнтамі і заўважаю, што цяпер яны сталі ўключацца ў навуковую дзейнасць адразу, з першага курса, сталі больш творчыя, хочуць прыкладаць максімум сваіх ведаў для дасягнення канкрэтных мэт. Гэта вельмі крута. Раней, калі разглядаць рэспубліканскія конкурсы навуковых работ, іх аўтарамі былі пераважна выпускнікі, а цяпер шмат першакурснікаў», — падзялілася назіраннямі дзяўчына.

Але навука — не адзінае захапленне суразмоўніцы. Зусім нядаўна яна адкрыла для сябе... кандытарскае мастацтва, і аказалася, што і там усё падпарадкоўваецца законам фізікі!

— Усё пачалося з таго, што ў Мінску праходзіў майстар-клас ад вядомага шэф-кухара па шакаладным дэкоры. І першае, што сказала кандытар: будзе складана, бо нас чакае практычны курс па крышталаграфіі, а яна стаіць побач з маёй любімай фізікай. Я ўсміхнулася, а майстар распавяла простай мовай тое, што нам на фізічным факультэце давodзілі пры дапамозе складаных матэматычных формул. З таго часу яшчэ раз упэўнілася, што гэтая навука — усюды. Цяпер, калі раблю тарты, заўсёды думаю, ці правільна зрабіла ўсё з пункту гледжання фізікі. Лічу, што гэта мне дапамагае.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з уласнага архіва гераіні.**


## Информация ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 4» о результатах финансово-хозяйственной деятельности за 2020 год

| № п/п | Наименование показателей | Единица Измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тыс. руб. | 193 339 | 227 476 |
| 2. | Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тыс. руб. | 186 977 | 218 719 |
| 3. | Прибыль (убыток) до налогообложения, всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тыс. руб. | 5 499 | 5 703 |
| 3.1. | В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тыс. руб. | 6 362 | 8 757 |
| 3.2. | прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тыс. руб. | -941 | -3070 |
| 3.3. | прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | тыс. руб. | 78 | 16 |
| 4. | Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тыс. руб. | 1 157 | 1 346 |
| 5. | Чистая прибыль | тыс. руб. | 4 342 | 4 357 |
| 6. | Долгосрочная дебиторская задолженность | тыс. руб. | 0 | 0 |
| 7. | Долгосрочные обязательства | тыс. руб. | 1 759 | 1 883 |
| 8. | Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде, всего | тыс. руб. | 1 115,4 | 1 172,0 |
| 9. | Дивиденды на одну акцию, начисленные в данном отчетном периоде | руб. | 1,27181 | 1,33635 |
| 10. | Количество простых (обыкновенных) акций, находящихся на балансе Общества | штук | 0 | 0 |
| 11. | Количество акционеров, всего | лиц | 2338 | 2 333 |
| | в том числе: | | | |
| 11.1. | юридических лиц | лиц | 1 | 1 |
| 11.2. | физических лиц | лиц | 2 337 | 2 332 |
| 12. | Среднесписочная численность работающих | лиц | 1 762 | 1 813 |
| 13. | Обеспеченность акции имуществом Общества | руб. | 29,19 | 23,99 |

Доля государства в уставном фонде эмитента составляет 51,30 %.

Основной вид деятельности, по которому получено двадцать и более процентов выручки от реализации продукции, работ, услуг – строительство.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за 2020 год — 30 марта 2021 г.

Проверка достоверности годовой бухгалтерской и финансовой отчетности ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 4» за 2020 год проведена ООО «МАиС Консалт Белстрой».

**Размер дивидендов на одну акцию составляет 1,271816951 рубля.**

**Выплата дивидендов, принадлежащих физическим лицам будет перечислена на лицевые счета ОАО «БПС-Сбербанк», а также производиться посредством почтовых переводов РУП «Белпочта» и выдачу в кассах филиалов Общества в срок до 31.05.2021.**

Дивиденды на акции, приходящиеся на долю акций уставного фонда, принадлежащих Комитету государственного имущества Минского городского исполнительного комитета, будут перечислены в бюджет г. Минска не позднее 22.04.2021 на расчетный счет финансового отдела администрации Центрального района г. Минска.

Адрес официального сайта ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 4» в глобальной компьютерной сети — http://stroytrest4.by.

УНП 100055368

## ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества ОАО «Телеханский завод столярных изделий» (УНП 200099487), объявляет о проведении 14.05.2021 г. с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона

**Предмет торгов:**

**Лот 1.** ОАО «Телеханский завод столярных изделий», предприятие как имущественный комплекс с регистрационным номером 0001436.

**Начальная стоимость:** 1 659 200 бел. руб.

**Минимальная стоимость:** 1 348 100 бел. руб.

**Размер задатка:** 5 % от начальной стоимости имущества в размере 82 960 бел. руб.

**Шаг аукциона:** 5 % от начальной стоимости имущества в размере 82 960 бел. руб.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

**Продавец:** ОАО «Телеханский завод столярных изделий».

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, ком. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 5 % от начальной стоимости лота не позднее 13.05.2021 г. на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 08.04.21 по 17.00 13.05.21 на bankrottorg.by. К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде, по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения.
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ и за публикацию объявлений в СМИ 4523,81 бел. руб., стоимость размещения объявления в Журнале «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие» согласно счет-фактуре, аукционный сбор – 1 % от конечной цены предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель (претендент) обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в сроки, установленные договором купли-продажи.

*Новыя старты*

# БЕЛАРУСЫ — ФІНАЛІСТЫ «ФЕРМЕРА-ПАЧАТКОЎЦА»



**У міжнародным вочным фінале бізнес-гульні будуць удзельнічаць дзесяць нашых каманд, паведамілі ў Цэнтральным камітэце БРСМ.**

Завяршыўся завочны міжнародны тур бізнес-гульні. Па яго выніках экспертны савет адабраў для ўдзелу ў суперфінале 34 каманды маладых фермераў з Расіі, Беларусі, Арменіі, Азербайджана, Казахстана, Кыргызстана і Германіі. У іх ліку — дзесяць нашых нацыянальных пераможцаў.

За перамогу ў міжнароднай бізнес-гульні пазмагаюцца аўтарскія калектывы жлобінскай гімназіі № 8 імя В. І. Казлова (праект «Хатка ў вёсцы»), клецкай гімназіі (праект «Творчая майстэрня»), Першамайскай сярэдняй школы Лідскага раёна (праект «Час&nok»), Станіслаўскай базавай школы Шаркаўшчынскага раёна (праект «Вырошчванне буякоў вузкалістых ва ўмовах прышкольнага вучэбна-доследнага ўчастка»), сярэдняй школы вёскі Вістычы Брэсцкага раёна (праект Herbal Line).

Таксама ў фінале возьмуць удзел аўтарскія калектывы Глыбоцкага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя (праект «Буякі — ягада, якая падаўжае жыццё»), Мар'інагорскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа імя У. Е. Лабанка (праект «Фермерская гаспадарка па вырошчванні гароднiны»), Беларускага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта (праект «Сельгаспрадукцыя оптам»), ААТ «Гомельпрамбуд» (праект «Сады Семіраміды»), прадстаўнік клуба маладых інвалідаў «САМІ», створанага ў Мікашэвічах пры філіяле Лунінецкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, Мікалай Мазоль (праект «Пчалярства»).

Правядзенне фіналу запланавана на май у адным з суб'ектаў Расійскай Федэрацыі. Удзельнікі атрымаюць экспертную ацэнку сваіх праектаў. Пераможцы будуць узнагароджаны дыпломамі і памятнымі падарункамі. Самай галоўнай узнагародай за працу стане міжнародная стажыроўка ў краіне-ўдзельніцы праекта.

Галоўная задача міжнароднай бізнес-гульні «Фермер-пачатковец» — выяўленне і падтрымка таленавітай моладзі, уцягванне яе ў працэс распрацоўкі і рэалізацыі бізнес-праектаў, скіраваных на стварэнне і развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці. Арганізатарам міжнароднага фіналу з'яўляецца Расійскі саюз сельскай моладзі. У Беларусі арганізатарам гульні выступае БРСМ пры падтрымцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# РАЗЕЛЫ, КАКАРЫКІ І КАРЭЛЫ...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Вядома, пры рэалізацыі праекта, якога нікoлі не існавала ў Беларусі, мы сутыкнуліся з шэрагам цяжкасцяў. Галоўнай праблемай стала набыццё папугаяў, я нават падумаць не магла, што пры іх куплі ёсць столькі нюансаў. Папершае, шукалі ўжо ручных птушак. Некаторыя пастаўшчыкі пераконвалі нас у гэтым, а ў выніку высветлілася, што птушаняты вельмі баяліся людзей, і нам даводзілася іх прывучаць. А часам здаралася, што папугай не кантактаваў з іншымі насельнікамі або быў агрэсарам. У такіх выпадках узяць птушак мы не маглі. Па-другое, аказалася, што відаў папугаяў існуе вельмі шмат, але ў нас у краіне можна набыць толькі малую частку, а хацелася зрабіць «Папугайню» максімальна насычанай. Цяпер у нас жывуць птушкі розных відаў: ад хвалістых усіх колераў вясёлкі да магутных сіне-жоўтых ара, якія маюць адчыняе свае дзверы і для дамашніх папугайчыкаў, чые гаспадары з розных прычын больш не могуць ці проста не хочуць іх дагледаць.

— Як я ўжо згадала, у мяне няма ветэрынарнай адукацыі, але гэта не з'яўляецца перашкодай. Шчыра кажучы, не думаю, што яна мне моцна дапамагла б. У нашай краіне пры падрыхтоўцы ветэрынараў большы ўхіл робіцца на вывучэнне папугаю не стала дрэнна, бо ім хапае лётнай прасторы, каб траціць энергію, атрыманую ад ежы.

— Калі з набыццём птушак ёсць цяжкасці, то з наборам супрацоўнікаў праблем не ўзнікала. Галоўным крытэрыем пры найме на работу ў нас з'яўлялася негалоснае правіла — «не баяцца папугаяў, маці і дзяцей», а астатняму мы навучым. (*Смяецца.*) Як мы ўжо тлумачылі, у кожнай птушкі свой характар, да якога трэба падладжвацца. У іх гэтак жа, як у людзей, бывае дрэнны настрой, і тое таксама трэба навучыцца адчуваць. Наведвальнікі могуць не адрозніваць, які з хвалістых сеў да іх на плячо, а мы ўмеем гэта рабіць, нават усім далі мянушкі. Па сакрэце кажучы, у кожнага нашага работніка ёсць свой любімчык сярод сотні птушак. Часам даводзіцца праяўляць кемлівасць, каб супакоіць занадта шумнае дзіця і навучыць яго паважаць птушыны свет. Ці ж наадварот, разняволіць замкнёных дзяцей і паказаць ім, што яркія птушаняты — нашы сябры.



Падчас гутаркі мы параўналі «Папугайню» з кантактным заапаркам, але Марта адразу ж нас паправіла. Суразмоўніца растлумачыла, што бессэнсоўна праводзіць такія паралелі, бо тут ёсць адно вельмі сур'ёзнае адрозненне: папугаі самі вырашаюць, сесці да вас на рукі ці не, у іх ёсць права выбару, чаго няма ў звяркоў у кантактных заапарках, дзе апошніх цiскаюць усе наведвальнікі.

— Пры ўваходзе ў зону з птушкамі ў нас вісіць вялікая памятка з правіламі бяспекі, дзе падрабязна напісана, чаго рабіць нельга. Напрыклад, сціскаць у руках птушачку, фатаграфаваць з успышкай. Таксама перад уваходам трэба апрацоўваць рукі антысептыкам... Ну, і адно з асноўных правілаў — трэба акуратна і павольна перасоўвацца ў птушніку, таму што многія папугаі яшчэ маленькія і любяць хадзіць па падлозе, і калі бегаць хутка, то можна выпадкова ім нашкодзіць. Абмежаванняў па ўзросце, фізічных або псіхічных асаблівасцях у нас няма, «Папугайню» можа, а, магчыма, нават павінен наведаць кожны. Такія зносіны — гэта своеасаблівая тэрапія, якая пазбавіць вас ад дрэннага настрою ў лічаныя секунды.

**«Адно з асноўных правілаў — трэба акуратна і павольна перасоўвацца ў птушніку, таму што многія папугаі яшчэ маленькія і любяць хадзіць па падлозе».**

самую моцную дзюбу. Таксама ёсць пара неразлучнікаў, разелы, какарыкі, карэлы і цэлае сямейства пеўчых птушак — усяго больш за шаснаццаць відаў. Часта нам прапаноўваюць асобін іншых парод: галубоў, фазанаў, паўлінаў, канарэек, але мы не ведаем, як папугаі ўспрымуць «чужых», таму не рызыкуем.

Акрамя афіцыйных пастаўшчыкоў, «Папугайня» жывёл, чым на сямейства птушыных. Усе веды для правільнага абыходжання са сваімі падапечнымі я атрымлівала вывучаючы самаадукоўваючыся, чытала розную літаратуру пра папугаяў, вывучала вопыт сваіх знаёмых, у каго ёсць такія гадаванцы. Цяпер у мяне досыць вялікая тэарэтычная і практычная база ведаў, таму з усім спраўляемся самі, але калі раптам здарaецца нешта сур'ёзнае, адразу ж звяртаемся да спецыяліста.

Па словах нашай суразмоўніцы, даглядаць птушак не так і складана. Галоўнае — добрае харчаванне. Асноўныя прыёмы ежы павінны праходзіць раніцай і ўвечары, да таго ж на працягу дня іх падкормліваюць яшчэ і наведвальнікі. Але ад перaядання яшчэ ні аднаму

**«Папугаі самі вырашаюць, сесці да вас на рукі ці не, у іх ёсць права выбару, чаго няма ў звяркоў у кантактных заапарках, дзе апошніх цiскаюць усе наведвальнікі».**

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**студэнтка IV курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**
**Фота дадзена суразмоўніцай.**


Отчет за январь–декабрь 2020 года

## ООО «Санта Ритейл»

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2020 года**

(тыс. руб.)

| Активы | Код строки | На 31.12.2020 | На 31.12.2019 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 313 879 | 112 793 |
| Нематериальные активы | 120 | 3 465 | 2 015 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 20 526 | 26 658 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 928 | 55 218 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 160 | 2 | 0 |
| Отложенные налоговые активы | 180 | 388 | 476 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **339 188** | **197 160** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 71 085 | 27 859 |
| в том числе: материалы | 211 | 6 179 | 2 153 |
| готовая продукция и товары | 214 | 64 906 | 25 706 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 8 914 | 16 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 5 560 | 3 535 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 48 268 | 6 652 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 0 | 56 019 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 16 785 | 6 974 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 6 | 0 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **150 618** | **101 055** |
| **БАЛАНС** | **300** | **489 806** | **298 215** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 31.12.2020** | **На 31.12.2019** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 159 655 | 72 288 |
| Резервный капитал | 440 | 15 | 15 |
| Добавочный капитал | 450 | 30 294 | 4 090 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | -49 553 | 12 211 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | | |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **140 411** | **88 604** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 215 073 | 145 138 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | | |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 1 784 | 113 |
| Доходы будущих периодов | 540 | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **216 857** | **145 251** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 11 118 | |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 63 | 119 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 121 357 | 64 241 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 107 635 | 60 956 |
| по авансам полученным | 632 | 876 | 150 |
| по налогам и сборам | 633 | 1 051 | 291 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 1 740 | 448 |
| по оплате труда | 635 | 4 368 | 1 806 |
| по лизинговым платежам | 636 | 5 399 | 386 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | | |
| прочим кредиторам | 638 | 288 | 204 |
| Доходы будущих периодов | 650 | | |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **132 538** | **64 360** |
| **БАЛАНС** | **700** | **489 806** | **298 215** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**за январь–декабрь 2020 года**

тыс. руб.

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2020 | За январь–декабрь 2019 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 665 276 | 374 612 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (512 714) | (300 587) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 152 562 | 74 025 |
| Управленческие расходы | 040 | (15 421) | (8 648) |
| Расходы на реализацию | 050 | (142 665) | (73 678) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | (5 524) | (8 301) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 26 862 | 19 098 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (7 111) | (4 862) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 14 227 | 5 935 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 4 729 | 4 284 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 3 186 | 113 |
| проценты к получению | 103 | 1 533 | 4 169 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 10 | 2 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (3 202) | (440) |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (3 186) | (440) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (16) | |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 17 032 | 9 308 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 17 032 | 9 308 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (31 014) | (16 896) |
| в том числе: проценты к уплате | 131 | (12 604) | (8 191) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (18 009) | (8 445) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (401) | (260) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130) | 140 | (12 455) | (3744) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140) | 150 | 1 772 | 2 191 |
| Налог на прибыль | 160 | | (13) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | 2 | |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (1 660) | 95 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | | |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (1) | (1) |
| Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200) | 210 | 113 | 2 272 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 3 875 | 574 |
| Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230) | 240 | 3 988 | 2 846 |

По аудиторскому заключению от 30 марта 2021 года аудиторской организации – ООО «Бейкер Тилли Бел» *(220007, г. Минск, ул. Суражская, 10, пом. 4, свидетельство о государственной регистрации зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190565204 решением Минского городского исполнительного комитета от 15.09.2004)* годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Санта Ритейл» по состоянию на 31 декабря 2020 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

УНП 291313486

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 26 апреля 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТы №№ 2, 5, 6, 9, 10, 14, 18, 20–22, 26–32, 34–36, 52–63) ранее опубликован в газете «Звязда» от 02.06.2020 г. № 105 (29219), www.bankrot.gov.by.**
**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**
**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович. Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**; **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 8 апреля 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 22 апреля 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5(пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 02.06.2020 г. № 105 (29219). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 27 апреля 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТы №№ 1–3, 6–9, 12, 14–26, 28, 32–37, 40–55, 59, 60, 65, 66) ранее опубликован в газете «Звязда» от 06.08.2020 г. № 151 (29265), www.bankrot.gov.by.**
**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**
**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62**

